Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 16 (895) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 22 КРАСАВІКА 1973 г. ЦАНА 60 гр.



Жанчыны з Арэшкава выступілі на аглядзе „Беларуская песня — 73“ усемярых: Вера Кашэль, Анна Парфенюк, Вера Хамацюк, Марыя Сцепанюк, Надзея Паўлючук, Ніна Аверчук, Тацяна Гурын.

Былі яны апрануты ў народныя беларускія ўборы: бардовыя доўгія саяны, вышываныя блузкі, на галовах чырвоныя шалінoўкі. Былі вельмі прыгожай і каляровай групай. Выглядалі дастойна, як каралевы. На аглядзе заспявалі дзве песні (згодна з правіламі), якія спакон вякоў спяваліся ў іхняй прыпушчанскай вёсцы: „Зялёная вішня“ і „Ой, аддала мяне маці“.

Спосаб іх спявання, таксама як іх уборы, не быў сапсаваны ніякімі чужымі ўплывамі. Іх народныя песні гучэлі, як рэха па ранняй расе, адбіваліся далёка і зноў вярталіся. Было ў іхніх песнях спакойнае раздолле палёў і Белавежскай пушчы з яе высокімі соснамі. Адна песня была з запяваннем. Запявала Вера Кашэль.

Найперш ціха радзіліся гукі, як бы набіралі сілы, а потым, падхопленыя ўсімі жанчынамі, вырасталі моцным крэшчэндам, каб пад канец зноў звінець ціхімі працяжнымі гукамі. Хочацца сказаць, што так арэшкаўскія жанчыны павінны спяваць заўсёды і ўсюды песні, ад матак і бабак завучаныя і жывучыя ў вёсцы, спяваныя пры кудзелі ў такт калаўротка, пры кроснах і ў вольныя святочныя дні.

✲

У цікавым і прыгожым месцы ляжыць вёска Арэшкава. Найперш з шашы Гайнаўка — Кляшчэлі трэба павярнуць налева. Пару кіламетраў шырокай выгоднай жвіроўкі завядуць вас у вёску. Тут прыемная цішыня сустрэне вас, хоць ведаеце, што праца ідзе, бо адчуваеце яе рытм у гэтай цішы. Працавітасць вёскі відаць у чысціні дамоў, у парадку на панадворках.

Узрадаваліся мы, калі пры мясцовай святліцы сустрэлі групу мужчын, якія па-гаспадарску разважна аб нечым гаварылі. Адзін з іх аказаўся мужам Веры Кашэль і ён завёў нас з уласцівай вёскі Арэшкава на адну з арэшкаўскіх калоній, якая завецца Альшынай (яшчэ дзве іншыя калоніі называюцца таксама прыгожа — Сасноўка і Выган). У Альшыне жывуць Кашалі. Заходзім у чыстую, пахнучую хлебам хату. Гэтая чысціня і парадак адразу родзіць у нас прыхільнасць да гэтых сімпатычных арэшкаўскіх гаспадароў.

Вера Кашэль сядзіць традыцыйна каля хлебнай печы і прадзе кудзелю. Белая пушыстая воўна на саматканыя дываны, якія гаспадыня потым паказвае нам. Узоры на іх

(Працяг на стар. 4)



Арэшкаўская сямёрка ва ўсёй сваёй красе на аглядзе «Беларуская песня — 73». Фота А. Карпюка.



Дзе як дзе, але на гаспадарцы трэба многа працаваць, калі хочаш быць сапраўдным гаспадаром. Работы тут хапае ад усходу да захаду сонца. Але толькі працавіты гаспадар, працавітая сям'я можа атрымоўваць высокія ўраджаі і добрыя вынікі ў развіцці жывёлагадоўлі, можа заможна жыць, смачна есці і прыгожа апранацца.

Да такіх людзей у Мілейчыцах залічаюцца Яўгень і Галена Абрамовічы. Сям'я іх складаецца з 6 чалавек, гэта значыць, Галены і Яўгенія, яго бацькі, дваіх дзяцей, якія ходзяць у мясцовую школу, і аднаго трохгадовага дзіцяці. Ёсць яшчэ маці Яўгеня. Але яна жыве цяпер у Беластоку ў свайго дарослага, жанатага сына, у якога няма каму даглядаць дзяцей. Вось таму старыя бацькі жывуць у дабравольнай разлуцы. А ўсё гэта, каб быць патрэбным і карысным сваім дзецям.

Бацька вельмі дапамагае Яўгеню, асабліва летам. Ён увесь час пасе кароў. А кароў у Абрамовічаў заўсёды 7—8 штук. Цяпер таксама 5 дойных кароў, а апрача таго, кожны год ёсць некалькі штук яловага быдла. Каровы заўсёды дагледжаны, даюць шмат малака, тлустасць якога заўсёды вышэй 4%. Дрэнна толькі, што палавіна зямлі і паша для быдла знаходзіцца ад іх хаты аж у 4 кіламетрах.

Кожны год Яўгень Абрамовіч прызначае на пашу для быдла пасевы сырадэлі ў граніцах 1 га. Пасля сырадэлі ў наступным годзе садзіць ён бульбу. Бульба з'яўляецца падставовым кормам для свіней, якіх па 10 і больш штук у год кантрактуе Абрамовіч і прадае дзяржаве. Амаль усе яны трапляюць у першую катэгорыю, бо вага іх не меншая, як 100 кілаграмаў, і не большая, як 120 кілаграмаў.

Кожны год прадаюць Абрамовічы па некалькі штук яловага быдла. Нядаўна таксама завезлі яны на базу ялоўку і бычка. Кормам для кароў, апрача сена і саломы, з'яўляюцца ў іх кармавыя буракі і бручка. Буракі ў мінулым годзе ўрадзілі добра. З 0,15 га было іх 15 вазоў, гэта значыць, каля 15 тон. Удалося Абрамовічу дастаць з Германіі высакаякаснае бурачанае насенне „цыклон“, якое дало добры ўраджай. Зразумела, што зямля пад буракі павінна быць належна падрыхтавана і ўгноена.

А ў Абрамовічаў двое коней, 7—9, а часамі больш штук быдла і заўсёды каля 20 штук свіней, так што гною шмат. Гной з хлявоў і мінеральныя ўгнаенні гарантуюць добрыя ўраджаі нават на невысакаякаснай зямлі. У мінулым годзе дзякуючы добраму ўгнаенню жыта таксама добра „пасыпала“: 25 цэнтнераў з аднаго га, у той час, калі сярэдняя гмінная — 21 цэнтнер, а сярэдняя павятовая — 23 цэнтнеры.

І сена нядрэнна родзіць. З першага і другога пакосаў сенажаць дае па 13-15 балонаў, а гэта ўжо шмат. 25-30 балонаў сена — гэта асноўны корм для быдла і коней.

(Працяг на стар. 4)



УВАГА, ЧЫТАЧЫ!

Выбіраем найактыўнейшую вёску па карэспандэнцыі для „Нівы“

Ставіцца тут адна ўмова: пісаць, пісаць і пісаць. Як найбольш. Пра ўсё добрае і кепскае. З сваёй вёскі і з суседніх. Пра здарэнні і людзей, пра дасягненні і памылкі, пра абрады і звычаі. Пісаць можа адзін з вёскі, двое, трое і кожны, хто толькі захоча.

Пад канец кожнага каляндарнага года палічым карэспандэнцыі з кожнай вёскі і аб'явім пераможцаў.

Узнагароды: урачыстае апублікаванне на першай старонцы „Нівы“ назваў і здымкаў перадавых вёсак і іх карэспандэнтаў.

Прыпамінаем, што за кожную апублікаваную карэспандэнцыю рэдакцыя плаціць аўтару ганарар.

Звяртаемся да ўсіх чытачоў і сімпатыкаў з просьбай: сваімі карэспандэнцыямі запісвацца на нашым лістку найактыўнейшай вёскі і найактыўнейшага карэспандэнта.





■ Варшаўскі аддзел БГКТ кожную пятніцу арганізоўвае для сваіх членаў і сімпатыкаў цікавыя мерапрыемствы. І так, напрыклад, 16 сакавіка старшыня навуковага гуртка пры ГП БГКТ Юрка Туронак выступіў з дакладам аб асвеце на Беласточчыне ад пачатку XIX стагоддзя да першай сусветнай вайны, а ў пятніцу 30 сакавіка — з дакладам аб гісторыі беларускага школьніцтва ад 1918 года па сённяшні дзень.

■ 25 сакавіка ў памяшканні варшаўскага аддзела правёў аўтарскую сустрэчу старшыня гэтага аддзела, паэт Алесь Барскі.

■ 30 сакавіка ўдзельнікі пленума павятовага праўлення Фронту адзінства народу ў Гайнаўцы былі слухачамі выступленняў лаўрэатаў павятовага агляду „Беларуская песня—73“. Выступілі: харавая група з Белавежы і салісты Юрка Харкевіч і Аляксандр Бандарук.

■ 31 сакавіка адбыўся сход у вёсцы Калодна ў Беластоцкім павеце. На ім старшыня праўлення беластоцкага павятовага аддзела БГКТ Янка Цялушэцкі расказаў аб ролі і заданнях БГКТ. Сярод прысутных 12 асоб падпісалі членскія дэкларацыі БГКТ і выбралі праўленне гуртка, у склад якога ўвайшлі: Ліда Казлоўская — старшыня, Мікалай Казлоўскі — сакратар і Уладзіслаў Тарасевіч — скарбнік. Пасля гэтага гурток намеціў план працы.



■ 7 красавіка гурток БГКТ у Гарадку арганізаваў сустрэчу з гміннымі партыйнымі, адміністрацыйнымі і гандлёвымі ўладамі. Гмінны партыйны камітэт ПАРП прадстаўляў яго сакратар Павел Кандрусік, улады гміны — Мікалай Матэйчук, ГС — прэзас Яўген Паплаўскі і яго намеснік Уладзімір Налівайка. На гэту сустрэчу запрошаны былі старшыня ГП БГКТ Мікалай Самоцік і кіраўнік аддзела культуры Павятовай рады нарадовай у Беластоку Аліцыя Янкоўская.

Супольна былі абмеркаваны справы, звязаныя з арганізаваннем акадэміі і мітынгу з нагоды Першага Мая і справы культурнай дзейнасці ў паасобных мясцовасцях гміны. Вышэй спамянутыя асобы, а таксама Ніна Цыванюк і Ніна Мушынская выступалі ў плённай дыскусіі. У канцы сходу старшыня гуртка БГКТ Ніна Мушынская 6 новым членам уручыла членскія легітымацыі.

■ 7 красавіка адбылася сустрэча галоўнага рэдактара „Нівы“ Георгія Валкавыцкага з чытачамі ў гарадскім аддзеле БГКТ у Беластоку. Расказаў ён аб працы рэдакцыйнага калектыву, а пасля адказваў на шматлікія пытанні прысутных.

■ На адкрытым сходзе (7.04.) гуртка БГКТ у Страшаве (старшыня гуртка БГКТ Зіна Пракапчук) старшыня павятовага праўлення БГКТ Янка Цялушэцкі гаварыў аб працы БГКТ у Беластоцкім павеце і аб заданнях гуртка ў іх вёсцы. (мх)

• Падзеі • Здарэнні • Факты • Каментарыі • Весткі •

 СВЕТ  БССР  ПОЛЬШЧА  ВАЯВОДСТВА

СВЕТ

ПАСЛЯ ВАРВАРСКАГА НАПАДУ

Урад Лівана падаў 10 красавіка ў адстаўку. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Лівана Саіб Салам пасля заканчэння экстраннага пасяджэння кабінета міністраў.

Пасяджэнне было склікана для абмеркавання вынікаў варварскага нападу ізраільскай ваеншчыны на Бейрут і Сайду, у выніку якога былі забіты і паранены больш чым 40 чалавек, у тым ліку кіраўнікі палесцінскага руху супраціўлення Мухамед Юсеф ан-Наджар (Абу Юсеф), Камаль Насер, Камаль Адуан.

Як даведваемся з апошняй хвіліны, справа нападу ізраільскай ваеншчыны на Ліван была ўнесена пад разгляд Бяспекі ААН. Савецкі прадстаўнік у ААН заявіў, што яго дзяржава будзе галасаваць за прапановай арабскіх краін аб выключэнні Ізраіля з Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

ПАДПОЛЬНАЯ ФАБРЫКА

Падпольная фабрыка, якая займалася вырабам наркотыкаў, была выяўлена ўсяго толькі праз два дамы ад... гарадскога паліцэйскага ўпраўлення Сан-Францыска.

У час аблавы было захоплена абсталяванне для вырабу наркотыкаў, выручка ад продажу якіх штомесяц складала па 150 тысяч долараў.

ЗАКОНАПРАЕКТ АБ КАНСТЫТУЦЫІ

Пераважнай колькасцю галасоў — 125 супраць 3 — Нацыянальная асамблея Пакістана адобрыла пядаўна законапраект аб новай канстытуцыі краіны.

У канчатковай рэдакцыі праект новай канстытуцыі вызначае Пакістан як федэральную дзяржаву з парламенцкай формай кіравання. Назва дзяржавы — „Ісламская Рэспубліка Пакістан". Пасля адабрэння прэзідэнтам канстытуцыя ўступіць у сілу 14 жніўня 1973 г.

Кіраўніком выканаўчай улады на канстытуцыі з'яўляецца прэм'ер-міністр, кіраўніком дзяржавы — прэзідэнт. Уся паўната заканадаўчай улады сканцэнтроўваецца ў руках двухпалатнага парламента. Чатыры правінцыі, якія складаюць краіну, атрымліваюць ад новай канстытуцыі значную аўтаномію. У кожнай з іх будзе мясцовы ўрад на чале з галоўным міністрам. Прэзідэнта ў правінцыі будуць прадстаўляць губернатары.

ВЕНГЕРСКІЯ АЎТОБУСЫ

Камфартабельныя венгерскія аўтобусы „Ікарусы" можна сустрэць на дарогах Польшчы, Чэхаславакіі, Савецкага Саюза і іншых краін. У мінулым годзе з канвеераў аўтобуснага завода „Ікарус" сышло 6.900 аўтобусаў.

З пачатку гэтага года філіялы завода ў Мацьяшфельдзе і Секешфехерваре пачалі выпуск новай мадэлі — „Ікарус - 200". Яна выразна адрозніваецца ад старой прыгожымі, сучаснымі формамі, больш умяшчальным і зручным салонам, павышанай магутнасці рухавіком і шэрагам іншых удасканаленняў. У гэтым годзе з завадскіх варот выйдуць 7.200 новых машын. Такі буйны рост гэтай галіны венгерскай прамысловасці стаў магчымым дзякуючы актыўнаму ўдзелу ВНР у міжнародным сацыялістычным падзеле працы. (ак)

БССР

ЗА ЧАТЫРЫ ДНІ

Па 38 цэнтнераў збожжавых з гектара — вось рубеж, за які змагаюцца сёлета ў саўгасе „Любанскі". Гаспадарка першай у раёне завяршыла сяўбу ранніх каласавых. 500 гектараў ячменю, 80 гектараў аўса і 20 гектараў яравой пшаніцы пасеяны за чатыры рабочыя дні. Цяпер усе сілы кінуты на бульбяныя палі.

60-ГОДДЗЕ „ПАЎЛІНКІ".

У Мінску адзначалася 60-годдзе з дня першай пастаноўкі несмяротнай Купалаўскай камедыі „Паўлінка". З гэтай нагоды адбылася сустрэча трох артыстак, якія на працягу мінулага 60-годдзя ігралі ролю галоўнай гераіні п'есы. Першай Паўлінкай была Паўліна Мядзёлка. Калі камедыя „Паўлінка" ставілася ўпершыню, яна была яшчэ студэнткай, вучылася ў Пецярбурзе. Іграць ролю Паўлінкі прасіў яе сам Я. Купала. Наступны Паўлінкі — гэта народная артыстка БССР Раіса Кашэльнікава і самая малодшая з іх, артыстка Ала Доўгая.

„СВІЦЯЗЬ" — НАРОДНЫ

Ансамбль песні і танца „Свіцязь" Навагрудскага раённага дома культуры існуе ад 1966 года. За высокае выканаўчае майстэрства, за актыўны ўдзел у мастацкім абслугоўванні насельніцтва калегія Міністэрства культуры БССР прысвоіла гэтаму ансамблю званне народнага.

20-ГОДДЗЕ „МАЛАДОСЦІ"

Вядомаму літаратурна-мастацкаму і грамадска-палітычнаму часопісу „Маладосць" споўнілася 20 год. Галоўным яго рэдактарам з'яўляецца зараз Генадзь Бураўкін, вядомы беларускі паэт і празаік маладога пакалення. Часопіс рэдагуецца цікава і змястоўна. Мае ён вялікія заслугі для беларускай літаратуры. Хопіць толькі напомніць той факт, што В. Быкаў, І. Навуменка, Р. Барадулін, В. Зуёнак і многа, многа іншых беларускіх пісьменнікаў пачыналі свой літаратурны шлях у „Маладосці".

З нагоды 20-годдзя часопіса „Маладосць" жадаем яго калектыву далейшых поспехаў і новых дзесяткаў тысяч чытачоў.

ІНТЭРВ'Ю ДАЕ МАКАЁНАК

Беларуская газета „Звязда" ад 8 красавіка гэтага года апублікавала цікавае інтэрв'ю з вядомым беларускім драматургам Андрэем Макаёнкам, чыя камедыя „Трыбунал" заваявала прыхільнасць жыхароў Беласточчыны. З гэтага інтэрв'ю вынікае, што А. Макаёнак неўзабаве парадуе нас нейкім новым творам. Між іншым, сказаў ён, запрашаюць яго ў Польшчу на прагляд „Трыбунала", у Балгарыю, дзе ставяць „Зацюканага апостала", на Узбекістан, у Растоў і ў Маскву. Слава пісьменніка пашыраецца.

ФІЛЬМ ПРА РАЗВЕДЧЫКА

Зараз у кінатэатрах дэманструецца мастацкі поўнаметражны фільм „Зямля, да запатрабавання", які адлюстроўвае лёс смелага разведчыка, Героя Савецкага Саюза — Льва Яфімавіча Меневіча. Нарадзіўся ён у Чавусах Магілёўскай вобласці. (вр)

ПОЛЬШЧА

ПЛЕНАРНАЯ СЕСІЯ СЕЙМА

Веснавая сесія Сейма ПНР прыняла важныя дзяржаўныя пастановы. Найважнейшая з іх гэта пастанова „Аб задачах народу і дзяржавы ў выхаванні моладзі і яе ўдзелу ў будове сацыялістычнай Польшчы". Пастанова гэта выплывае з VI з'езду ПАРП і VII пленума ЦК.

Сейм прадоўжыў таксама кадэнцыі рад нарадовых да 30 лістапада гэтага года.

З праграмным выступленнем аб сацыялістычным выхаванні на сесіі выступіў прэм'ер Пётр Ярашэвіч.

ЧАРГОВЫЯ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ ПАРП

Чарговыя партыйныя справаздачна-выбарныя канферэнцыі адбыліся ў ваенным флоце, вайсках паветранай абароны, авіяцыйных вайсках, адбыліся таксама ваяводскія канферэнцыі ў Зялёнай Гуры і Вроцлаве.

СУСТРЭЧА І САКРАТАРА ЦК ПАРП З КІРАЎНІЦТВАМ ЗСЛ

На гэтай сустрэчы прысутнічалі таксама члены Палітбюро і члены НК ЗСЛ. Старшыня НК ЗСЛ С. Гуцва паінфармаваў Э. Герка пра працу кангрэсу ЗСЛ і далейшую дзейнасць.

ФЕДЭРАЦЫЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ САЮЗАЎ ПОЛЬСКАЙ МОЛАДЗІ

Ужо распачала дзейнасць Федэрацыя сацыялістычных саюзаў польскай моладзі. Гэта новая, вышэйшая і больш зінтэграваная форма маладзёжнага руху. У склад федэрацыі ўваходзяць: ЗМС, ЗСМВ, СЗСП, ЗГП і СЗМВ. На чале федэрацыі стаіць Галоўная рада. Яе старшынёю быў выбраны Станіслаў Цёсэк. Прадстаўнікоў Выканаўчага камітэта, які былі выбраны з Галоўнай рады, прыняў Э. Герэк.

ПРЭЗІДЭНТ ФІНЛЯНДЫІ У ПОЛЬШЧЫ

Па запрашэнню старшыні Рады дзяржавы Г. Яблонскага прабываў у Польшчы з візітам прэзідэнт Фінляндыі Урха Кеканен.

У 200 ГАДАВІНУ КАМІСІІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

У Варшаве адбылася навуковая сесія, звязаная з 200-ай гадавінай Камісіі нацыянальнай адукацыі. Удзельнікі яе сабраліся ў Станіславаўскай бібліятэцы адбудоўваемага Каралеўскага замку, дзе і 200 год таму сабраліся стваральнікі Камісіі нацыянальнай адукацыі.

ХУТЧЭЙ РАЗВІВАЦЬ ЭНЕРГЕТЫКУ

І сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк і члены Палітбюро — П. Ярашэвіч і Я. Шыдляк у суправаджэнні міністраў наведалі электроўню ў Казеніцах і пляцы будоў электроўняў у Паланцы і Белхатове. Мэтай візіту і размоў з будаўнікамі электроўняў было шуканне адказу на пытанні, як хутчэй развіваць польскую энергетыку.

НАВУКОВАЯ СЕСІЯ Ў 30-УЮ ГАДАВІНУ ПАЎСТАННЯ Ў ГЕЦЕ

Мінула 30 год з таго часу, калі ў Варшаўскім геце пачалося ўзброенае паўстанне замкнутага там яўрэйскага насельніцтва. З гэтай нагоды Інстытут гісторыі ПАН і Яўрэйскі гістарычны інстытут арганізавалі навуковую сесію, прысвечаную гэтай праблеме. (вл)

ВАЯВОДСТВА

ПЕРШАМАЙСКІ КАМІТЭТ

11 красавіка пачаў сваю працу ваяводскі камітэт па арганізацыі святкавання Першамая. Узначальвае камітэт І сакратар ВК ПАРП З. Куроўскі. У склад камітэта ўвайшлі партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, кіраўнікі вялікіх прадпрыемстваў, рэктары беластоцкіх вышэйшых навучальных устаноў, перадавікі прамысловых прадпрыемстваў, передавыя сяляне, прадстаўнікі маладзёжных і жаночых арганізацый.

З ПРАЦЫ ПВРН

На апошняй сесіі Прэзідыума ВРН, якая адбылася 11 красавіка, абмяркоўвалася дзейнасць Ваяводскага праўлення Польскага камітэта грамадскай дапамогі. Гэта арганізацыя дзейнічае ўжо ў нашым ваяводстве 15 год. Прэзідыум звярнуў асаблівую ўвагу на хатнюю апеку над хворымі старымі людзьмі, на пашырэнне юрыдычных парад і дапамогу ў атрыманні аліментаў на дзяцей і старых. Разглядаліся на пасяджэнні таксама справы аховы вод ад прамысловых сцекаў. Вырашана было зрабіць неабходныя крокі для хутчэйшай аддачы ў карыстанне ачышчальняў, якія знаходзяцца ў будове, і палепшыць працу існуючых ачышчальняў.

ФЕСТЫВАЛЬ МУЗЫКІ І ПАЭЗІІ

У Беластоку праходзіў V Агульнапольскі фестываль музыкі і паэзіі, арганізаваны пад пратэктаратам міністра культуры і мастацтва пры актыўнай падтрымцы ваяводскіх улад і беластоцкай грамадскасці. У фестывалі ўдзельнічалі вядомыя ў краіне музыканты і акцёры, вядомыя музычныя калектывы і аркестры. Адбылося 9 канцэртаў, падсумаваннем якіх быў апошні, з удзелам вялікага сімфанічнага аркестра Польскага радыё пад кіраўніцтвам таленавітага кампазітара і дырыжора Казіміра Корда.

ПОМНІК ЗАМЕНГОФУ

14 красавіка, у гадавіну смерці вядомага ўсяму свету беластачаніна Людвіка Заменгофа, стваральніка міжнароднай мовы эсперанта, на скверыку па вул. Фарнальскай у Беластоку адбылося адкрыццё помніка-скульптуры вучонага. Помнік паставіла сусветная арганізацыя эсперантыстаў пры дапамозе Прэзідыума Гарадской рады нарадовай.

ПЕРШАЕ МЕСЦА

Вучні Беластоцкага малачарскага тэхнікума выйшлі пераможцамі краёвага конкурсу ведаў у галіне перапрацоўкі малака. Удзельнікамі конкурсу былі вучні чацвёртых класаў малачарскіх тэхнікумаў і тэхнікумаў харчовай прамысловасці. Пераможцы атрымалі права паступлення ў сельскагаспадарча-тэхнічную акадэмію ў Ольштыне без уступных экзаменаў. (яч)

ГП БГКТ выказвае глыбокае спачуванне члену Прэзідыума ГП БГКТ, старшыні Гайнаўскага аддзела БГКТ АЛЯКСАНДРУ ІВАНЮКУ з прычыны смерці маці.



Niedziela — 22.IV

8.55 Program dnia. 9.00 Dla młodych widzów: „Świąteczny teleranek". 10.10 „Na jeziorze Mikra Prospa" odc. IV filmu dokum. z serii „Świat, który nie może zaginąć". 10.35 Film muzyczny TVP „Wesele we wsi Wilkołaz". 11.05 Klub Sześciu Kontynentów. 11.45 Dziennik. 12.00 „Spotkanie w Bocheniu". 12.30 Program muzyczny. 13.10 „Piórkiem i węglem". 13.40 Teatr Młodego Widza: Molier — „Szelmostwo Skapena". 15.00 Losowanie Totolotka. 15.20 „Najdalej w Polsce". 15.50 „Pojedynek — 2" (runda 3) Tadeusz Ross — Jacek Żemantowski. 16.40 Estrada Poetycka: K. I. Gałczyński — „Pieśni". 16.55 „Co to jest" — filmowy program rozrywkowy. 18.45 Kryteria — felieton Władysława Loranca. 18.00 PKF. 18.10 Tele-Echo. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Spotkanie w Sankt-Petersburgu", cz. V filmu ser. prod. polsko-franc. pt.: „Wielka miłość Balzaka". 20.55 Mistrzowie operetki — „Jan Strauss — w takcie na 3/4". 22.00 Wiadomości sportowe. 22.15 „Rzymskie wakacje" — film fab. prod. USA.

Poniedziałek — 23.IV

7.55 Program dnia. 8.00 TV Kurs Rolniczy. 8.35 Przypominamy, radzimy. 8.45 Radar. 9.00 Dla dzieci: „Dyngusowy Zwierzyniec". 10.10 W starym kinie: „Jadwigi Smosarskiej portret listów". 11.05 „Pucheroki, Siudababa i dziady Śmiguśne" — widowisko folkolorystyczne („Zwyczaje i obrzędy"). 11.45 Dziennik. 12.00 Sportowy magazyn sprawozdawczy. 13.40 Dla dzieci: „Tajemnica dziadkowego skarbu". 14.40 Jan Kiepura — portret artysty. 15.35 „Z kamerą wśród zwierząt". 16.05 Telewizyjny Teatr Muzyki „Bachalie", 17.05 „Potomkowie Sebastiana Grzybka" — film dokum. 17.45 „Taksówkarz i gangsterzy" — fab. film. francuski. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: Aleksander Fredro — „Mąż i żona". 21.35 „Nareszcie razem" — program z udziałem Maryli Rodowicz i Urszuli Sipińskiej. 22.20 Magazyn sportowy. 22.50 „Gry" — film baletowy TVP.

Wtorek — 24.IV

10.00 „Spotkanie w Sankt-Petersburgu" cz. V filmu ser. prod. polsko-franc. „Wielka miłość Balzaka". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Telewizja Młodych. 18.20 TV Kurier Mazowiecki. 18.40 Podyskutujmy: „Mój chłopiec, moja dziewczyna". 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Ujarzmienie ognia" — cz. I film fab. prod radz. 21.25 „Plastyka po szwedzku — sztuka użyteczna". 21.55 Studio przebojów — program rozrywkowy TV NRD. 22.35 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Środa — 25.IV

10.00 „Ujarzmienie ognia" — cz. I fab. film radziecki. 14.00 Wybieramy zawód. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: film z serii: „Dzieci świata" — „Dahomey". 17.35 Informacje — Towary — Propozycje. 17.55 „Przez Afrykę" — dokum. film czechosłowacki (odc. VI). 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 Publicystyka międzynarodowa. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Ujarzmienie ognia" — cz. II fab. film prod. radz. 21.25 „Z gracją" — odc. VII („Balet"). 21.55 Magazyn Medyczny. 22.40 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Czwartek — 26.IV

10.00 „Ujarzmienie ognia" — cz. II fab. film prod. radz. 14.00 Matematyka w szkole — Funkcje, równania i nierówności. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem" 17.45 PKF. 17.55 „Pieśni krainy Gwarków" („Z ludowej szkatuły"). 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Zapis pamięci" — film dokum. 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Brudne porachunki" — film („Alfred Hitchcock przedstawia"). 20.55 „Wiosenny raport" — program ekonomiczny. 21.20 Wieczór z Jarosławem Haszkiem — „Zaręczyny mojej siostry". 22.00 Dialogi historyczne — Znaczenie historii dla kultury społeczeństwa. 22.30 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Piątek — 27.IV

9.05 „Brudne porachunki" — film. 9.55 Dla szkół: Wychowanie obywatelskie — kl. VII. 10.55 Dla szkół: Geografia — kl. VII — Japonia. 12.45 TV Technikum Rolnicze — Chemia. 13.25 TV Technikum Rolnicze — Język polski. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora". 17.25 Nie tylko dla pań. 17.50 Gramy o telewizor. 18.15 Turystyka i wypoczynek. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 Orbita — mag. nauki i techn. krajów socjalist. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Bez przerywników — włoski program rozrywkowy. 20.50 Panorama. 21.30 Estrada Literacka: „Pisane w Ravensbrück". 22.05 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Sobota — 28.IV

8.20 „Sól ziemi czarnej" — fab. film polski. 9.55 Dla szkół: Geografia — kl. V. 10.55 Dla szkół: Nauka o człowieku" — kl. VIII. 11.55 Dla szkół: Geografia — kl. VIII. 14.20 TV Technikum Rolnicze — Chemia. 14.55 TV Technikum Rolnicze — Język polski. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 TV Informator Wydawniczy. 16.30 Dziennik. 16.40 „Bilet" — konkurs dla młodz. szkół średnich o tematyce geograficznej, poświęcony Związkowi Radzieckiemu. 17.30 Spotkanie z przyrodą. 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Sól ziemi czarnej" — fab. film prod. polskiej. 21.55 Dziennik. Wiadomosci sportowe. 22.20 Teatr Rozrywki: Adam Asnyk „Komedia konkursowa".



Piątek, 20 kwietnia

8.30 Film fab. 11.00 Szkoła szachowa. 11.30 Filmy dokument. 14.15 Program dnia. 15.00 Akademia i koncert. Z Pałacu Zjazdów. 19.00 Czas. 19.30 Spektakl TV. 20.40 Białoruś — kraj pieśni. Koncert. 21.05 Panorama nowin.

Sobota, 21 kwietnia

7.00 Program dnia. 8.00 Przegląd międzynarodowy. 8.15 Film dokument. 9.15 Koncert. 11.00 Pieśni A. Nowikowa. 11.45 Spektakl TV. 13.45 Film fab. 16.30 Film fab. 17.30 Czas. 18.45 Piłka nożna. „Spartak" — „Ararat". 2 połowa. 20.00 Koncert.

Niedziela, 22 kwietnia

7.00 Program dnia. 8.00 Dla żołnierzy. 8.45 Transmisja sportowa z Wilna. 9.45 Film dokument. 11.50 Film fab. 13.30 Klub filmowy. 14.30 Film dokument. 15.00 Piłka nożna. „Zaria" (Woroszyłowgrad) — „Dniepr" (Dniepropietrowsk). 2 połowa. 16.00 Piłka nożna. „Dynamo (Mińsk) — „Dynamo" (Tbilisi). 18.20 Film fab. 19.55 Czas 20.25 Program sportowy.

Беларуская сялянска-рабочая грамада была адзінай у сваім родзе з'явай. У Еўропе міжваеннага перыяду было шэраг краін з вострай аграрнай праблемай, напрыклад, Румынія, з масавым сялянскім рухам, як у Балгарыі, са складанымі нацыянальнымі ўзаемаадносінамі, як у Югаславіі, Чэхаславакіі і іншых. Аднак ні ў адной з гэтых краін не паўстала ў тым часе такая масавая, актыўная і так моцна звязаная з сялянскімі масамі народна-вызваленчая арганізацыя, якая б дзейнічала пад ідэйным кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Калі ў дваццатых гадах нашага стагоддзя шукаем прыкладу, які б сведчыў аб ролі рабочага класа як кіруючай сілы ў народна-вызваленчым руху і які б сведчыў аб правільнасці і пладатворнасці нацыянальнай палітыкі, заснаванай на ленінскіх прынцыпах — такім прыкладам з'яўляецца Грамада".

Гэтае сцверджанне пачэрпнута з даклада Ю. Кавальскага „Польскі камуністычны рух і вызваленчая барацьба беларускага народа. Месца БСР Грамады ў гісторыі", якім адкрываецца нядаўна выйшаўшы з друку зборнік „Паўстанне і дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады на Беласточчыне"[1]). Зборнік падрыхтаваны М. Насовічам, выдаў Аддзел прапаганды Ваяводскага камітэта ПАРП у Беластоку. Змест выдання склалі прачытаныя даклады і выступленні ў дыскусіі на папулярна-навуковай сесіі, прысвечанай 40-ой гадавіне ўзнікнення Грамады і праходзіўшай 27 кастрычніка 1965 года ў Беластоку.

Ю. Кавальскі ў сваім дакладзе прадставіў на фоне аналізу цяжкага сацыяльнага і нацыянальнага палажэння працоўных мас гарадоў і сёлаў Заходняй Беларусі працэс нараджэння і развіцця беларускага народна-вызваленчага руху на гэтай тэрыторыі, а таксама кіруючую ролю Камуністычнай партыі Польшчы і яе секцыі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў арганізацыі і дзейнасці Грамады.

„Дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады на Беласточчыне (гады 1926—1927)" — гэта манаграфічнае даследаванне Б. Нікіцюка, у якім ён паказаў прадпасылкі паўстання Грамады, яе гурткоў, гмінных і павятовых камітэтаў.



УСКАЛЫХНУЛА НАРОД...

Абапіраючыся на друкаваныя і архіўныя крыніцы, а таксама на ўспаміны былых дзеячоў-грамадаўцаў, аўтар шырока прадставіў шматгранную дзейнасць гэтай арганізацыі на тэрыторыі тагачаснага Беластоцкага ваяводства. Каштоўнасць даклада Б.Нікіцюка павялічваецца яшчэ і тым, што ў яго дапаўненні знаходзім пералік мясцовасцей, у якіх дзейнічалі гурткі Грамады, і прозвішчы іх арганізатараў або найболей актыўных членаў. Аўтар прыходзіць да вываду, што „Грамада адыграла важную ролю ў рэвалюцыйным сялянскім руху ў нашым ваяводстве. Да сялянскіх мас несла яна праўду аб буржуазна-памешчыцкай Польшчы, выкрывала ілжывасць тагачаснага ўраду і паказвала правільны рэвалюцыйны шлях паляпшэння палажэння працоўнага люду".

У дыскусіі Н. Каменская паінфармавала аб працах вучоных БССР над гісторыяй Грамады і выказала ўпэўненасць, што „дзякуючы супольным намаганням даследчыкаў мінулага Польшчы і Беларусі цяжкая і складаная гісторыя Грамады будзе ўсебакова вывучана". А. Бергман у сваім выступленні прааналізавала сувязі і ўзаемаадносіны паміж КПЗБ і БСРГ, падкрэсліваючы, што „Грамада ўскалыхнула народ і ў гэтым яе гістарычная роля". М. Арэхва як былы член Цэнтральнага камітэта КПЗБ прадставіў працу цэнтральных органаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі над стварэннем і пашырэннем дзейнасці Грамады. М. Арэхва сцвярджае, што „ўтварэнне БСР Грамады і яе дзейнасць была вялікім дасягненнем КПЗБ і КПП у здзяйсненні партыйнага кіраўніцтва барацьбой беларускага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне". А. Фідаркевіч — былы пасол у сейм ад Незалежнай сялянскай партыі — прадставіў сумесную барацьбу прадстаўнікоў КПП і іншых прагрэсіўных партый і арганізацый, а ў іх ліку паслоў Грамады на чале з Б. Тарашкевічам, у тагачасным польскім парламенце. П. Пестрак сваё выступленне прысвяціў паказу адухатвараючай ролі Грамады ва ўздыме „на вышэйшую ступень класавай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа" ў былой Заходняй Беларусі. А. Баршчэўскі прааналізаваў прамовы Б. Тарашкевіча ў сейме. Падкрэслівае ён, што „выступленні Тарашкевіча ў сейме здзіўляюць не толькі глыбінёй палітычнай думкі, але і з'яўляюцца вельмі цікавымі з пункту гледжання літаратурнай формы, мастацкіх прынцыпаў і прыёмаў красамоўства". С. Малько, закранаючы праблему месца і ролі Грамады, якая складалася са звыш 100 тысяч членаў, у рэвалюцыйным руху міжваеннай Польшчы, заўважае, што „без камуністычнай партыі, без яе палітычнай платформы, без кіруючай ролі пралетарыяту ў народна-вызваленчым руху немагчымым было б ва ўмовах Заходняй Беларусі бурнае развіццё Грамады і яе народна-рэвалюцыйны характар". А. Зданук расказаў аб працы гурткоў Грамады, арыштах і катаваннях паліцыяй яе членаў. Аб кіраванні КПЗБ працай гурткоў, гмінных і павятовых камітэтаў Грамады паведаміў Я. Забаўскі. У Юзвюк прадставіў дзейнасць гуртка Грамады ў Трасцянцы Гайнаўскага павету. Дзейнасць Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба „Змаганне" на Беласточчыне ў гадах 1929 — 1930 прадставіў Г. Маецкі. У. Станкевіч падзяліўся ўспамінамі аб дзейнасці Грамады ў раёне Бераставіцы. Пасля ліквідацыі санацыйнымі ўладамі Грамады, былыя грамадаўцы па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам КПЗБ стваралі гурткі Таварыства беларускай школы і разгортвалі ў іх палітычную і асветніцкую дзейнасць. Аб дзейнасці ТБШ расказваюць яго былыя актывісты В. Склубоўскі і П. Кізевіч.

М. Арэхва напісаў спецыяльна ў зборнік і даслаў з Мінска абшырны і вельмі каштоўны па свайму зместу артыкул „Працэс 133" у Беластоку. Успаміны ўдзельніка". На вельмі багатым фактычным матэрыяле аўтар (быў ён вязнем, засуджаным на 8 год турэмнага заключэння) паказвае катаванні і здзекі паліцыі над арыштаванымі КПЗБ-оўцамі і грамадаўцамі ў турмах Бельска і Беластока, прадстаўляе гераічнае змаганне вязняў і нязломнасць іх перакананняў.

Зборнік узбагачан архіўнымі здымкамі дзеячоў КПЗБ і БСР Грамады, а таксама фотакопіямі дакументаў.


Цяжка перацаніць каштоўнасць выдання зборніка. Ён паведамляе сярэдняму і маладому пакаленню нашага грамадства вялікую праўду аб тым, што сучасны іх шчаслівы дзень быў заваяваны ў цяжкой і крывавай барацьбе іх жа бацькоў і дзядоў супраць буржуазна-памешчыцкага ладу санацыйнай Польшчы.

Мікалай Гайдук

[1]) Powstanie i działalność Białoruskiej Włościańsko-Robotniczej Hromady na Białostocczyźnie (Materiały z sesji popularnonaukowej), Wydawca: Wydział Propagandy KW PZPR w Białymstoku, 1973, s. 178.



І сакратар ПК ПАРП Юзэф Пяхоўскі адкрывае Ізбу.



(Злева) Старшыня ГП БГКТ Мікалай Самоцік, І сакратар ПК ПАРП Юзэф Пяхоўскі, І сакратар гарадскога камітэта ПАРП у Бельску Васіль Грыгарук і праваднік па выстаўцы Барыс Нікіцюк наведваюць Ізбу.

Старонкі гісторыі

У Агульнаадукацыйным ліцэі імя Б. Тарашкевіча адбылася нядаўна нештодзённая ўрачыстасць. 31 сакавіка была тут адкрыта Ізба народнай памяці.

Ізба змешчана ў адным з класных памяшканняў. Штодзённа будуць тут адбывацца заняткі вучняў ліцэя. Тут будуць яны атрымліваць лекцыі па старажытнай і навейшай гісторыі.

На ўрачыстасць адкрыцця Ізбы прыбылі дзеячы ППР і ЗВМ, а таксама дзеячы падпольнага руху супраціўлення з часоў фашысцкай акупацыі. Іх фотаздымкі і фотакопіі дакументаў упрыгожваюць сцены выстаўкі. На іх знаходзім прозвішчы Р. Возняка, старасты Бельскага павету, В. Грыгарука, вядомага маладзёжнага і партыйнага дзеяча на Бельшчыне. Сярод заслужаных здымкі і прозвішчы ЗВМ-оўцаў з Плёскаў, армоўцаў з Бельскага павету, якія сабраліся на караул перад чарговай акцыяй, і іншыя.

Ганаровае месца займаюць планшы, якія датычаць дзейнасці Браніслава Тарашкевіча. Аўтары сцэнарыя Ізбы ўкампанавалі вельмі прыгожыя здымкі з жыцця чалавека, імя якога носіць школа, і многія фотакопіі матэрыялаў, якія датычаць дзейнасці гэтага выдатнага дзеяча за прагрэс і роўныя правы беларускага народа ў міжваенны перыяд. Многія даныя аб багатай і разнастайнай дзейнасці Браніслава Тарашкевіча перадала Аляксандра Бергман, выдатны знаўца біяграфіі Тарашкевіча і перыяду, у якім прыйшлося яму дзейнічаць.

Ізба памяці — гэта вельмі добрая наглядная лекцыя для сучаснага пакалення і таго, хто хоча параўнаць мінулае з сучасным і будучыняй.

Тэкст і фота А. Карпюка



З. Яканюк, Я. Лях і Н. Гініт — вучаніцы Медыцынскага ліцэя ў Бельску зацікавіліся старонкамі жыцця Б. Тарашкевіча.



Дырэктар ліцэя мгр А. Карпюк з педагогамі і вучнямі вітае гасцей.



Вучні беларускага ліцэя ўпісваюцца ў памятную кніжку Ізбы.


Будова святліц на Бельшчыне

У кожнай вёсцы неабходна святліца або клуб. Выкарыстоўваюцца яны як цэнтры культуры, як месцы сходаў і культурнай „разрыўкі".

На Бельшчыне з кожным годам колькасць святліц павялічваецца. У мінулым годзе працягвалася будова святліц у Дубяжыне, Кнарыдах, Алексіне, Сасінах і Дубне. У гэтым годзе арганізаваліся камітэты будовы святліц у Чэхах Забалотных, Крывой, Тапчэве, Дзяцінным і Верцені.

У Чэхах Забалотных арганізатарамі будовы святліцы і арганізатарамі грамадскіх чыноў з'яўляюцца гурткі Саюза сацыялістычнай вясковай моладзі і Беларускага таварыства. Дзеяч гэтых арганізацый Анатоль Лукашук з'яўляецца таксама старшынёй камітэта будовы. (мх)

Пачатак на стар. 1



Сям'я Абрамовічаў

Зямлі ў Абрамовічаў 10 га. Уся іх сям'я, нават дзеці шмат працуюць на зямлі. Сямікласніца Варварка дагледзіць усё: і гусят, і куранят, і ў хаце ўсё зробіць, і трохгадовай сястрычкай заапякуецца. Пяцікласнік Зютак на касярцы фурмануе падчас сенакосаў. Часта з Варваркай набіраюць бульбу, засыпаюць яе ў парнік і вараць для свіней.

Добрыя даходы з гаспадаркі дазволілі Абрамовічам некалькі год таму назад пабудаваць вялікую клуню і яшчэ адзін прасторны хлеў размерам 19 метраў на 6,5 м. У гэтым будынку ёсць і летняя кухня, у якой знаходзяцца хлебная печ і печка. Калі пацяплее, Абрамовічы вараць у летняй кухні аж да восені. У хаце тады чысцей, яшчэ прыемней, і не трэба цягнуць туды ані дроў, ані вады, ані бульбы, ані іншых прадуктаў.

Хату ў мінулым годзе Абрамовічы таксама аднавілі. Аббілі сцены пільснаю і памалявалі; знялі з даху чарапіцу і пакрылі тэрнітам.

У Абрамовічаў на найбліжэйшы перыяд запланаваны наступныя інвестыцыі: I) зрабіць 38 метраў жалезнай агароджы, 2) купіць і абсталяваць „сілу", 3) купіць сабе млынок-„сьрутоўнік", 4) дабіцца яшчэ лепшых вынікаў у сельскагаспадарчай прадукцыі.

У свабодны ад працы час Абрамовічы любяць паглядзець тэлевізійныя перадачы. Ад моманту куплі ўласнага тэлевізара яны маюць кантакт са светам. Сваімі вачамі бачаць дзяржаўных дзеячоў, артыстаў, розныя гарады і г.д.

Два гады таму назад Яўген Абрамовіч уключыўся ў агульнаваяводскі конкурс „Беластоцкая вёска — гаспадарная і культурная". У спаборніцтве дасягнуў добрых вынікі і яму прызнана званне „майстра сельскагаспадарчай прадукцыі". Ён таксама з'яўляецца адным з двух солтысаў у Мілейчыцах і належна выконвае сваю ганаровую функцыю. Ён добры член ПАРП і актыўны член БГКТ.

Міхась Хмялеўскі

Беларускія кнігі

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Дзіцячы фальклор, 1972, стар. 736, цана 20 зл. 70 гр.

Гэта чарговы том з цыкла „Беларуская народная творчасць", які выпускае Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. Складальнікам тому з'яўляецца Г. А. Барташэвіч. Уступныя артыкулы напісалі Г. Барташэвіч і В. Ялатаў. У том увайшло 1117 твораў, большасць песень мае ноты. Змест тому — гэта калыханкі, забаўлянкі, песні, заклічкі, прыгаворкі, дражнілкі, лічылкі, гульні. Надзвычай багаты, чароўны свет мелодый, павучальных і займальных твораў, якімі абдаравала вусная народная творчасць беларускага народа малалецтва і дзяцінства.

Бандарчык В. К., Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі, 1972, стар. 168, цана 5 зл. 50 гр.

Кніга належыць пяру выдатнага сучаснага беларускага фалькларыста. Яна прысвечана гісторыі вывучэння быту і культуры беларускага народа за гады Савецкай улады.

Гісторыя беларускай савецкай музыкі, 1971, стар. 544, цана 15 зл. 30 гр.

Кнігу напісалі вядомыя знаўцы беларускай музыкі Г. С. Глушчанка, Л. С. Мухарынская, С. Г. Нісневіч, К. І. Сцепанцэвіч, Т. А. Шчарбакова. Гэтае выданне з'яўляецца падручнікам па гісторыі беларускай музыкі савецкага часу, адрасаваным да студэнтаў музычных вышэйшых навучальных устаноў, але адначасова яно — дасканалы даведнік з гісторыі гэтай галіны культуры Беларускай ССР.

Янка Купала, 1972, стар. 176, цана 19 зл. 70 гр.

Альбом, прысвечаны жыццю і творчасці песняра беларускага народа, склалі І. К. Жыдовіч і Я. Ю. Рамановская. Уступ напісаў вядомы беларускі пісьменнік старэйшага пакалення Міхась Лынькоў. Выданне багата ілюстравана. У яго канцы змешчан летапіс жыцця, літаратурнай і грамадскай дзейнасці Янкі Купалы.

Дасканалая рэч! Яна павінна абавязкова быць у кожнай бібліятэцы, а таксама ў руках усіх настаўнікаў беларускай мовы. Вельмі карысны дапаможнік на ўроках роднай мовы.

Кнігарня імпартных выданняў у Беластоку ахвотна высылае кнігі за паштовым залічэннем з далучэннем рахункаў. Затрабаванні кіруйце па адрасу:

„Dom Książki", Białystok, ul. Kilińskiego 10. (мг)

Пачатак на стар. 1

Таленты з Арэшкава

даўнія, прыгожыя — раслінныя матывы, часам птушыныя.

Гаспадар — Валодзя Кашэль прысеў таксама бліжэй печы. Найперш слухае маю размову з Верай, а потым і сам дапаўняе цікавыя інфармацыі пра жонку, пра іншых жанчын у вёсцы, што яны здольныя пеўчыя і песні іх прыгожыя. І кажа, нібы канчаючы свае ўнутраныя думкі: „Няхай і пра Арэшкава з-за бабаў будзе напісана ў газеце".

У вёсцы ёсць штаб людзей, ды выдзяляюцца жанчыны, якія ўжо многа год спяваюць на розных вясковых святах і гадавінах. Для рэпетыцый збіраюцца па хатах, бо клуб вечарамі займаюць мужчыны. Маюць у запасе многа колішніх песень. Вера Кашэль кажа: „Калісь не было куды пайсці, то я помню, малая была, круцілася каля мамы і ўсё галаву дурыла: мама, навучы песню. І мама вучыла мяне..."

Арэшкаўскія пеўчыя належаць да пакалення 45—48-годкаў. Гэта добры век, калі можна і пра сябе падумаць, і пра працу. Праўда, пры Веры Кашэль круціцца ўжо чатырохгадовая ўнучка Эля і ад бабулі вучыцца жыць і працаваць. Таксама песні вучыцца спяваць. Але ўлюбёную песню пра камара спявае з дзедкам Валодзем.

*

За непаўторны народны каларыт, аўтэнтычныя, народныя ўборы і такія ж песні, журы цэнтральнага агляду „Беларуская песня — 73" аднадумна прызнала арэшкаўскім спевакам спецыяльную ўзнагароду „Нівы" з пажаданнем, каб яны і далей працавалі ў тым жа напрамку.

Вера Леўчук

НА КУЛЬТУРНАЙ НІВЕ

Добрыя традыцыі

Кіраўнік клуба «Рух» Марыя Галашэўская.

Адным з найлепш дзейнічаючых клубаў „Рух" не толькі ў павеце, але і ў цэлым ваяводстве з'яўляецца клуб, які існуе пры гмінным цэнтры культуры ў Боцьках Бельскага павету. У мінулым годзе другі раз заняў ён заслужанае другое месца ў конкурсе на найлепшы клуб. Клуб у Боцьках цесна спалучае сваю дзейнасць з ГОК-ам, які ўзначальвае Генавефа Луц'ян. Для кіраўнічкі клуба „Рух" Марыі Галашэўскай і Генавефы Луц'ян цэнтр культуры з'яўляецца другім домам. Тут яны праводзяць найбольш часу. З вялікай ахвотай расказалі яны нам аб слаўным мінулым іх ранейшай святліцы ды вядомага нават у ваяводстве вакальна-музычнага калектыву пад назвай „Боцькавяцы". Гэты калектыў выконваў перш за ўсё мелодыі на народных матывах. Цікава было паслухаць аб дружным грамадскім чыне жыхароў Боцькаў пры пабудове новага будынка для цэнтра і аб актуальных напрамках дзейнасці ГОК-у. Зараз ГОК у Боцьках адзін з найпрыгажэйшых: новая мэбля, кветкі ў вазонах, каляровыя заслоны на вокнах... Дзейнічаюць тут дзіцячы танцавальны гурток, вакальна-музычны, дэкламатарскі, фатаграфічны, гурток жывапісцаў, акардэаністаў, спартыўны (адзін з найбольш актыўных), клуб любіцеляў тэатра і іншыя. Усе яны дзякуючы правільнай каардынацыі працы дабіліся значных поспехаў. Адлюстроўваюць гэта клубныя сценгазеты і хроніка. Гаспадарамі клуба з'яўляюцца члены ЗСМВ, што вельмі важна ў культурнай дзейнасці, дзе „адзін у полі не воін". Моладзь і старэйшыя жыхары Боцькаў ахвотна прыходзяць у клуб на сустрэчы з прадстаўнікамі творчых асяроддзяў, на канцэрты ансамбляў песні і танца, на танцавальныя вечарыны, якія тут спалучаюцца з конкурсамі і мастацкай праграмай.

Спыталі мы пра дасягненні з апошняга перыяду. У адказ нашы субяседніцы падалі іх нямала: першае месца ў конкурсе на найпрыгажэйшую ляльку ў нацыянальным касцюме адной з рэспублік Савецкага Саюза, другое месца ў конкурсе на савецкую песню і на ваяводскім аглядзе калядных калектываў. У працы ГОК-у дапамагаюць Ірэна Лукашэвіч, Дануся Яблонская, Эдвард Карнашэўскі, Марэк Лясоцкі, Янка Длужэўскі, Людміла Карнашэўская, Рышард Свярчэўскі, Мікалай Турковіч, доктар Зіна Купрыянюк-Данілюк, Тэрэза Лабашак, Люба Галінская, Рахэля Сабковіч і іншыя.

Цяпер моладзь рыхтуе пастаноўку пад загалоўкам „Ці гэта каханне?" Кукальны калектыў рыхтуе п'есу „Аб сабачцы, які меў быць шчоткай". Новую праграму рыхтуе вакальна-музычны калектыў. Кіраўнік ГОК-у апрацоўвае хроніку культурных дасягненняў. У хроніку ўведзены многія матэрыялы, якія публікаваліся на старонках „Нівы".

Тэкст і фота Я. Цялушэцкага.



Кіраўнік ГОК Г. Луц'ян (першая злева).



Нашаніўская пара

„НАША НІВА" Ў АЦЭНЦЫ КРЫТЫКАЎ — ЗАКАНЧЭННЕ

Займаючыся аглядам ацэнак „Нашай нівы" з боку крытыкаў — публіцыстаў, гісторыкаў, палітыкаў і гісторыкаў літаратуры мы прывялі далёка не ўсе характэрныя галасы і выказванні. Не гаворачы ўжо аб міжваенным перыядзе, калі паявілася грамадная колькасць супярэчлівых выказаў на тэму „Нашай нівы", таксама пасля II сусветнай вайны апублікавана нямала пазбаўленых паслядоўнасці артыкулаў. Адны з аўтараў запісваюць „Нашу ніву" да дэмакратычных перыёдыкі, другія называюць яе газетай буржуазнай, рэакцыйнай і нацыяналістычнай, а трэція бачаць у ёй памочніка бальшавіцкага друку ў Беларусі. Дзе праўда? Які характар мела „Наша ніва" — рэакцыйны ці рэвалюцыйны? Кожная крайняя ацэнка гэтага часопіса пазбаўлена сэнсу.

„Наша ніва" не была ні рэакцыйнай, ні бальшавіцкай, але належала, несумненна, да дэмакратычнага напрамку ў тагачаснай еўрапейскай перыёдыцы. „Наша ніва" была тыповай сялянскай газетай. Адлюстраваліся ў ёй усе бакі сялянскай псіхікі, сялянскіх імкненняў і сялянскіх надзей. У яе публіцыстыцы падкрэсліваліся ўсе супярэчлівасці сялянскага жыцця і сялянскага руху. „Наша ніва" была настолькі кансерватыўнай і настолькі рэвалюцыйнай, наколькі было кансерватыўным і рэвалюцыйным беларускае сялянства.

Ці ж на працягу дзевяці гадоў існавання „Нашай нівы" паявіліся ў ёй артыкулы, насычаныя нянавісцю да рускай, польскай, украінскай, літоўскай ці якой-колечы іншай нацыі? Ці калі-колечы ў „Нашай ніве" былі апублікаваны артыкулы, аўтары якіх баранілі інтарэсы памешчыцтва?.. Ці калі-колечы „Наша ніва" пахваляла вайну? Ці ж на працягу дзевяці гадоў свайго існавання „Наша ніва" не дамагалася грамадскіх змен, нацыянальнай школы, еднасці беларусаў-каталікоў і беларусаў-праваслаўных? Ці ж „Наша ніва" не друкавала на сваіх старонках творы дэмакратычных пісьменнікаў Расіі, Польшчы і Украіны? Што было галоўнай мэтай „Нашай нівы"? Яе ідэйным заклікам, яе праграмай, яе імкненнем было імкненне перадавой часткі беларускага сялянства і беларускай інтэлігенцыі. Імкненне гэтае найпаўней выявілася ў паэтычным радку Купалы — „Людзьмі звацца!" „Наша ніва" старалася ўзбудзіць у беларусах пачуццё нацыянальнай і чалавечай годнасці. Гэта значыць старалася ўзняць беларускі народ да ўзроўню нацыянальнай свядомасці рускіх і палякаў. Гэты станоўчы аспект дзейнасці „Нашай нівы" быў заўважаны і падкрэслены Горкім. Несумненна, да гэтага аспекту беларускага руху адклікаўся і Ленін, які ў 1914 годзе напісаў, што мара беларусаў аб айчыне мае дэмакратычны характар. Ленін заўсёды адрозніваў нацыяналізм народа пануючага і нацыяналізм народа зняволенага, пазбаўленага сваёй дзяржаўнасці і нацыянальнай незалежнасці. Гэты апошні нацыяналізм быў з'явай непазбежнай, быў лагічным вынікам няволі.


Можам знайсці і ў сучасным свеце многа прыкладаў, якія сведчаць аб тым, што нацыяналізм прыгнечанай нацыі з'яўляецца вынікам прыгнёту пануючага народа. Прыклады такія знойдзем у многіх каланіяльных і паслякаланіяльных сістэмах. Дарэвалюцыйная Беларусь была калоніяй Рускай імперыі. Не рускі народ, а толькі царская сістэма загнала Беларусь у ярмо няволі. Рускі селянін і рускі рабочы не мелі ніякай карысці з таго, што беларус жыў у бядзе, што не меў нацыянальнай школы, што не меў ніякіх форм самаўправы. І таму дамагаючыся паляпшэння сялянскага жыцця, дамагаючыся беларускай школы і аўтаноміі, „Наша ніва" не выступала супраць сялян і рабочых якой-колечы суседняй нацыянальнасці. Выступала толькі і выключна супраць царскай сістэмы і супраць памешчыцкай стыхіі.

„Наша ніва" дала пачатак беларускаму нацыянальнаму адраджэнню, беларускай асвеце, беларускім выдавецтвам, беларускай літаратуры, беларускаму тэатру, беларускім аб'яднанням і таварыствам.

Ці ж гэта не было выкарыстана пры рэалізацыі ў 1919 годзе Ленінскай думкі аб стварэнні суверэннай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы? Нягледзячы на тое, што „Наша ніва" не была рэвалюцыйнай і бальшавіцкай газетай і не вяла беларусаў у напрамку сацыялістычнай рэвалюцыі, то ўсё ж такі грунт, створаны ёю, аблегчыў у многім ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі, якая праводзілася ў БССР пасля Кастрычніка.



Дзень 15 сакавіка бягучага года быў звычайным, буднім, рабочым днём у працы пачатковай школы ў Саках Гайнаўскага павету. Урок гісторыі ў адным са старэйшых класаў адбываўся пры тэлевізары, па якому ішла спецыяльная перадача, прысвечаная жыццю і



Працавітыя дні ў М. Майстровіча...

дзейнасці Станіслава Канарскага. На вялікім перапынку ўся школа высыпалася на прасохшую школьную пляцоўку і інтэнсіўна выконвала міжурочную фізічную зарадку. Адразу было відаць, што гэта форма заняткаў у Саках здаўна вядзецца рэгулярна, бо ўсе 157 школьнікаў ахвотна і спраўна выконвалі практыкаванні. Снегу ўжо амаль не было, і дырэктар школы Міхал Майстровіч, улавіўшы вольную хвіліну, заняўся з вучнямі пятага класа вясеннімі парадкамі вакол школы. Праўда, прыбіраць асабліва не было чаго — каля школы пануе ўзорны парадак ды чысціня, але знайшлося ўсё ж крыху леташняга лісця ды сухой травы. І яны былі з педантычнай дакладнасцю заграблены.

— Свой выбар настаўніцкай прафесіі я зрабіў даўно, яшчэ быўшы вучнем пачатковай школы ў Орлі, — прызнаецца М. Майстровіч. — Рашаючы ўплыў на гэта меў вобраз і прыклад майго настаўніка і выхаваўцы Лашкевіча. Ён ужо не жыве, але яго светлы вобраз у мяне захаваўся назаўсёды. Гэта быў сапраўдны прыяцель дзяцей і добры методык. Потым я паступіў у Педагагічны ліцэй у Бельску і там сустрэўся з другім выдатным чалавекам — настаўнікам беларускай мовы Фёдарам Скокам. Ён адкрыў перада мной чароўную прыгажосць роднай мовы. Настаўнічаць я пачаў у 1955 годзе ў Чыжах, потым вучыў у Дубічах Царкоўных, і ад 1961 года працую тут, у Саках. Вось ужо 11 год дырэктарам. У 1962 годзе закончыў аддзяленне беларускай філалогіі Завочнай настаўніцкай студыі ў Беластоку. Выкладаю беларускую мову, фізіку, хімію, тэхнічнае выхаванне. Хутка плыве час, — з сумам заўважае дырэктар, — вось толькі па сваіх выхаванках ды сівых валасах на ўласных скронях заўважаеш яго няспынны бег.

Ходзім з дырэктарам па класах і кабінетах — добрае абсталяванне, многа дапаможнікаў, чысціня. Усюды відаць рука і вока добрага гаспадара.

— Не маеце часам цяжкасцей у сваёй працы? — пытаюся.

— Спецыяльных цяжкасцей не адчуваю, хоць і не лёгкі гэта кусок хлеба — дырэктарства. Аж сорамна прызнацца, але да гэтага часу ні адзінага разу не быў я ў сапраўдным адпачынку — у здраўніцы ці на курорце. Кожныя канікулы, калі не ў мяне курс, то ў маёй жонкі, а як не курсы — дык рамонты. Усё няма як. Але звыкся я ўжо з гэтым. Найбольшая мая прыемнасць — гэта вядзенне ўрокаў. Змучаны ты ці не, здаровы ці недамагаеш, калі ж уваходзіш у клас — усё сыходзіць на другі план. Перад табой толькі вучні і прадмет. І задавальненне, калі бачыш дапытлівасць дзяцей, іх зацікаўленне прадметам. Часценька даводзіцца застацца і пасля ўрока, каб дадаткова нешта растлумачыць, паясніць...

— Ці здараюцца ў вас і цяжкія выхаваўчыя праблемы?

— Асаблівых не было: моладзь у нас сціплая і працавітая. Бацькі жыва цікавяцца і навукай дзяцей і іх паводзінамі. Але ёсць і такія, што за пляценнем каробак ды матаў з саломы свету перад сабой не бачаць. Да заробкаў на пляцёнках і дзяцей заганяюць са школы для навукі, зразумела. Прыходзіцца гаварыць, выясняць.

Школа ў Саках карыстаецца аўтарытэтам у наваколлі, а бацькі ахвотна ўдзельнічаюць у грамадскіх чынах пры яе разбудове (дабудавалі майстэрню для практычна-тэхнічных заняткаў, дзве залы на класы і фізкультурную залу — разам вартасцю каля 500 тысяч злотых, у тым 50 працэнтаў грамадскага ўкладу). Цяпер плануюць далейшую разбудову фізкультурнай пляцоўкі і пасадку саду ў гонар 30-годдзя Народнай Польшчы.

Але не толькі справы школы ляжаць на сэрцы ў Міхала Майстровіча. Ён — старшыня гміннага камітэта Фронту адзінства народу ў Кляшчэлях. Член ПАРП і лектар партыйнай асветы ў падставовай партыйнай арганізацыі ў Саках. Радны гміннай рады нарадовай у Кляшчэлях і адначасова сакратар яе камісіі асветы і культуры. За кожнай з гэтых ганаровых і адказных функцый крыецца крапатлівая штодзённая ахвярная праца дырэктара Міхала Майстровіча.

Мікалай Гайдук
Фота аўтара

ПРАДУКЦЫЯ ДЛЯ СЯЛЯН


Усюды многа будуецца: і ў вялікіх гарадах, і ў мястэчках, і на вёсках. Запатрабаванне на будаўнічыя матэрыялы вялікае. Будаўнічых бетонных элементаў таксама разыходзіцца вельмі многа. Не залежваюцца яны на складах будаўніча-мантажных прадпрыемстваў.

Нядаўна наведалі мы бетанярню ў Валілах. На пляцы спаткалі сялян з Новай Волі, якія прыехалі па бэлькі на хлявы. Выконваючы абавязкі кіраўніка Юрка Купрашэвіч паведаміў нам, што іх прадпрыемства мае найбольш заказаў на элементы „страповыя“. Сяляне купляюць таксама шмат пустакоў, якія прадукуюцца тут ад красавіка да канца верасня. Асартымент прадукцыі параўнальна большы, бо і плыты на ходнікі, і кравэнжнікі, і трэлінка, і цэмбравіны да студзенак, а нават нетыповыя элементы выпрабляюцца гэтым прадпрыемствам. У мінулым годзе план прадукцыі склаў суму 4,5 мільёна злотых. 32-асабовы калектыў прадпрыемства значна перавыконваў планы. План прадукцыі на 1973 год павялічаны да 6 мільёнаў злотых, але рабочыя хочуць і гэты план значна перавыканаць. Няма тут такіх, што занядбоўваюцца ў працы. Ёсць толькі аб'ектыўныя цяжкасці — хаця б клопаты з давозам жвіру з Калоднага і недахопы сталі. А ўсё ж графік планаванай прадукцыі апярэджваецца.

(мх)

Ф·А·Л·Ь·К·Л·О·Р

СЯМЕЙНАЯ



Дай Божа нідзелькі прыждаці,
Та я пайду да роду гуляці,
Та я пайду да роду гуляці.
Як мне скажут да дна выпіваці,
Я й ні буду да дна выпіваці,
Я й ні буду да дна выпіваці.
Я й ні буду да дна выпіваці —
Ёсць у міне дзве беданькі ў хаці,
Ёсць у міне дзве беданькі ў хаці:
Адна беда — дзеціна малая,
Друга беда — свекруха ліхая.
Друга беда — свекруха ліхая.
Хоць ліхая, вечэрэньку варыць,
А свёкерко дубінаньку парыць.
А свёкерко дубінаньку парыць.
А хоць парыць, та ні будзя біці —
Седзіць мілы — будзя бараніці.
Седзіць мілы — будзя бараніці.
Седзіць мілы, дробны лісты пішэ —
Ён малую дзіціну калышэ.
Ён малую дзіціну калышэ:
— Люляй, люляй, дзіціна малая,
Гуляй, гуляй, жонка маладая!
Гуляй, гуляй жонка маладая.
Гуляй, гуляй, жонка маладая,
Паколь мая галоўка жывая.
Паколь мая галоўка жывая.
Бо як мая галоўка хібнецца,
Тады твае гулянне мінецца.
Тады твае гулянне мінецца.

Ад Зоф'і Марцінчык, 1921 года нараджэння, вёска Меляшкі Беластоцкага павету, запісаў 24 студзеня 1973 г. Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.



„Хачу табе, „Ніва“, напісаць аб становішчы сваёй вёскі і папрасіць дапамогі. Цяжка нам, жыхарам вёскі Нетупа. Знайшлася прычына, якая палохае гаспадароў. Некаторыя нават гатовы зрачыся бацькоўскіх загонаў, калі няма ўласнай рабочай сілы. Нельга сказаць, што няма ў нас сельскагаспадарчых машын. Нашу вёску абслугоўвае гуранскі сельскагаспадарчы гурток. Аднак яго кіраўнікі дрэнна выконваюць паверанымі ім абавязкі, хаця бяруць за гэта немалую зарплату. У выніку іх нядбайства жыхары навакольных вёсак трацяць многа часу і маюць вялікія затраты. Між іншым, адчулі гэта і нашы гаспадары, ходзячы ў час жніва за снопавязалкай, без якой не хапала нам сілы адолець жніво. Пасля дзвюх нядзель гэтай хадзьбы мы ўнеслі скаргу на старшыню Рыгора Турыча... Але тое не найгоршае, што было, а тое, што будзе, бо Турыч цяпер смяецца над намі: у гэтым годзе не запісаў нават на паперы, якія і калі будуць патрэбны нам паслугі сельскагаспадарчых машын, што ў іншых вёсках ужо зрабіў, а нам загадаў купляць коней, якіх мы па двое трымаць не можам. І яшчэ да таго загадаў бухгалтэры выставіць нам нейкія дадатковыя рахункі, аб якіх мы самі не знаем, і нам папрыходзілі ўпамненні. Цяпер нас страшаць: „Паплаціце хутчэй, а то каморнік прыйдзе“.

Рашыў я пашукаць выясненняў у павятовым камітэце партыі ў Саколцы. Сакратар па сельскагаспадарчых справах тав. Анатоль Цішэўскі добра ведае патрэбы сялян у гэтым павеце.

— Сельскагаспадарчы гурток у Гуранах, — гаварыў ён, — адзін з лепшых на Саколшчыне. Яны супольнымі сіламі апрацоўваюць там шмат дзяржаўнага фонду зямлі. У мінулым годзе з плошчы ў 50 гектараў сабралі ў Гуранах звыш 30 цэнтнераў жыта з кожнага гектара. Спрадвякоў не было ў Гуранах такога ўраджаю. Гэты подзвіг тамашніх гурткоўцаў варты пахвалы і распаўсюджвання. Але і жыхары гэтай невялічкай вёскі, з якой напісалі да вас ліст, таксама людзі сапраўды працавітыя. Нядаўна я быў у іх на сходзе, прысвечаным абмеркаванню „Ліста Сакратарыята ЦК партыі і Прэзідыума ўрада аб павышэнні жывёлагадоўлі і сельскагаспадарчай вытворчасці“. Аднесліся да гэтай справы ў Нетупе вельмі станоўча і прынялі на сябе даволі каштоўныя абавязацельствы.

— А што, таварыш сакратар, мяркуеце аб гэтых канкрэтных закідах, якія знаходзяцца ў лісце?

— Многа мужчын з вёскі Нетупа працуе ў лесе. Гаспадаркамі займаюцца жанчыны. Ім трэба дапамагчы. Гэта факт. У час мінулагодняга жніва сапраўды былі ў мяне дзве жанчыны з Нетупы са скаргаю на Турыча, што не дае ім снопавязалкі. Хапіла адной тэлефоннай размовы, каб гэтую справу вырашыць. Іншыя закіды, асабліва той, што дыспетчар гуранскага гуртка не захацеў прымаць заказаў на гэты год, мы зараз выяснім у размове з зацікаўленымі.

І сапраўды, неўзабаве сакратар, Турыч і я сядзелі разам у рэдакцыйнай машыне ды імчаліся ў Крынкі на пасяджэнне гміннага камітэта партыі.

Турыч — чалавек старэйшага ўзросту, пасівелы, год пад 60, з выгляду тыповы селянін. Бароніцца заўзята.

— Значыць што не даў снопавязалкі? А дзе ж я іх меў браць усім у адзін дзень? Ды свае, кулковае збожжа чакала. Я тады не ведаў, што такое сон... Не запісваў на 1973 год? Ну, гэта дык зусім хлусня! Я асабіста ва ўсіх гаспадароў пабываць не магу, але ў Нетупе былі члены праўлення нашага гуртка. Можна праверыць у кніжцы запісаў.


— Ну, ладна, — супакойвае яго сакратар. — Не нервуйся, Турыч. Трэба ж у Нетупу яшчэ раз паехаць, спытаць усіх гаспадароў і абмеркаваць усё дакладна. Там жа ёсць партыйная арганізацыя, сакратаром якой з'яўляецца таварыш Звяжынскі, чалавек разумны. Хай вам дапаможа. Аформіце гэта?

— Зразумела, — адказаў Турыч.

Віктар Рудчык



...820 асоб з Беластоцкага ваяводства паглыбляе свае веды ў тэлевізійным сельскагаспадарчым тэхнікуме, дзякуючы якому можа павышаць свае кваліфікацыі моладзь, якая застаецца на вёсцы і вядзе гаспадаркі.



Снавальны ўчастак Віцебскай шоўкаваткацкай фабрыкі.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

Беларускія тканіны

Тэкстыльная прамысловасць Беларусі, як і многія іншыя галіны, пачынала практычна ад нуля. Вялікі край з 10-мільённым насельніцтвам, які здаўна славіўся сваім ільном, вырабіў у 1913 годзе ўсяго дзесяць тысяч метраў льняных тканін. Забягаючы наперад, заўважым, што Аршанскі льнокамбінат спраўляецца з гэтай нормай крыху больш чым за гадзіну.

Пачатак вялікаму беларускаму тэкстылю быў палажаны ў гады першай пяцігодкі. На ўскраіне старажытнага горада Оршы быў пабудаваны буйны льняны камбінат. Гэты горад і цяпер называюць льняной сталіцай Беларусі. У перадваенным 1940 годзе камбінат вырабіў больш 15-ці мільёнаў метраў льняных тканін — лічба па таму часу немалая.

У гады II сусветнай вайны Беларусь панесла вялікія страты. У руінах ляжалі гарады і вёскі. Загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі. Фашысты рабавалі, разбуралі і палілі ўсё, што стваралася многія гады. Выпуск тканін у 1945 годзе склаў менш паўпрацэнта даваеннага, гэта значыць, зменшыўся ў 200 разоў.

Тое, што адбылося ў эканоміцы рэспублікі за пасляваенныя гады, часта называюць „беларускім цудам". І сапраўды, Беларусь у кавачна кароткія тэрміны выйшла на даваенныя рубяжы і хутка рушыла наперад. Цяпер аб'ём яе прамысловай вытворчасці пераўзыходзіць даваенны прыкладна ў 13 разоў.

Бурны росквіт перажывае і тэкстыльная прамысловасць.

Пабываем на Мінскім камвольным камбінаце, адным з буйнейшых у рэспубліцы і ў Савецкім Саюзе тэкстыльных прадпрыемстваў. Абшырны комплекс цэхаў і вытворчасці, поўны тэкстыльны цыкл, сучаснае высокапрадукцыйнае абсталяванне. Сямітысячны калектыў, які называюць жартам „жаночым царствам". Жанчын і дзяўчат тут 80 працэнтаў. Гэта не толькі радавыя ткачыхі, прадзільшчыцы, снавальшчыцы, але і камандзіры вытворчасці.

Камбінат адзін можа апрануць краіну з насельніцтвам у 10—12 мільёнаў чалавек па самых шчодрых нормах. Заўважым для аматараў „глабальных" параўнанняў, што з гадавой прадукцыі камбіната можна зрабіць метровы ходнік, які працягнецца з поўначы на поўдзень праз тры Амерыкі. Камбінат выпускае тканіны 34 відаў. У кожным відзе — 3-4 розныя адценні. Усяго 160 колерамалюнкаў — поўная радуга! Чатыры віды тканін — „Кветка", „Лада", „Чайка", „Старт" — атрымалі Дзяржаўны Знак якасці. Гэта значыць, што яны стаяць на ўзроўні лепшых сусветных узораў. Тканіны мінскіх камвольшчыкаў можна ўбачыць на прылаўках магазінаў у любым кутку Савецкага Саюза.

Дзевятая пяцігодка (1971—1975 г.г.) тэкстыльнай прамысловасці Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюза — пяцігодка далейшага якаснага і колькаснага росту.

Агульны выпуск тканін у рэспубліцы перавысіць у 1975 годзе 310 мільёнаў квадратных метраў — рост у параўнанні з канцом мінулай пяцігодкі больш, чым на 40 працэнтаў. Асабліва хутка будзе павялічвацца выпуск высакаякасных тканін. Выпрацоўка шаўковых тканін, напрыклад, вырасце за пяць гадоў у 3,5 раза. Упершыню ў краіне будзе асвоены выпуск тонкіх льняных тканін тыпа батысту (3 мільёны квадратных метраў у год). Цяпер Дзяржаўны Знак якасці прысвоены прыкладна ста відам тканін. „У гэтай пяцігодцы, — заявіла міністр лёгкай прамысловасці Беларусі Марыя Конанава, — мы ставім сваёй мэтай усю выпускаемую прадукцыю давесці да ўзроўню лепшых узораў".

За апошнія гады ў тэкстыльнай прамысловасці ўсё большае прымяненне знаходзяць сінтэтычныя валокны — лаўсан, капрон, нітрон. Беларуская прамысловасць вырабляе іх у велізарных колькасцях. Магілёўскі камбінат, першая чарга якога ўвайшла ў строй яшчэ ў восьмай пяцігодцы, разлічаны на выпуск 50 тысяч тон лаўсана ў год. Чатырыста мільёнаў метраў тканін у год можна вырабіць з капрона, які выраблае Гродзенскі хімічны камбінат. Хутка пачне выпуск нітрона — аднаго з лепшых заменнікаў воўны — хімічны камбінат у Полацку. Першая чарга гэтай вытворчасці будзе даваць 30 тысяч тон нітрона штогод.

Патэнцыял тэкстыльнай прамысловасці Беларусі атрымае новы вялікі прырост. У дзевятай пяцігодцы будуць уведзены ў строй Магілёўскі шоўкавы і Гродзенскі прадзільна-ніткачны камбінаты, трэція чарга Аршанскага льнокамбіната, заводы па комплекснай перапрацоўцы ільну. Пачнецца будаўніцтва трох спецыялізаваных баваўняных заводаў у Гомельскай вобласці і Асіповіцкага льнокамбіната.

Яшчэ больш узрасце тэхнічнае ўзбраенне дзейнічаючых прадпрыемстваў: яны атрымаюць і ўжо атрымліваюць высокапрадукцыйныя безверацённыя прадзільныя машыны, безчаўночныя ткацкія станкі, аўтаматычныя сістэмы кіравання вытворчасцю. Усё гэта дазволіць павялічыць прадукцыйнасць працы за пяць год больш чым на адну трэць.

Б. Усціна́ў

Куток практычных ведаў



МОДА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Ёсць два спосабы, паводле якіх клапатлівыя маці апранаюць сваіх дзяцей. Тыя, што маюць некалькі дзяцей, любяць купляць рэчы больш дарагія, добрай якасці, паколькі, калі адно дзіця рэч паносіць, то пасля яго можа насіць другое, а нават і трэцяе дзіця. Тыя ж, хто мае адно дзіця, найахвотней купляюць рэчы можа менш трывалыя, менш моцныя, але больш эфектныя і модныя.

Як вядома, дзіцячая мода змяняецца вельмі паволі, а прынамсі намнога вальней, чым мода для дарослых, аднак і тут штораз паяўляецца нешта новае.


У даны момант дзяцей апранаюць больш-менш так, як і дарослых, іх сукеначкі і сарафаны падобны да маміных, а „гарнітуры" да бацькавых.

Шыючы нешта для дзіцяці, трэба памятаць, што дзіцячая вопратка павінна быць вельмі зручная. Дзеці зазвычай вельмі многа знаходзяцца ў руху, жывыя, таму павінны сябе адчуваць добра ў сваёй вопратцы. Сукеначкі для дзяўчат шыюцца наогул расшыраныя ўнізе, найчасцей неадразныя, без паяскоў у таліі. Найлепш, калі паясок будзе ніжэй таліі і не будзе сціскаць маленькай фігуркі. Шырокія павінны быць таксама рукавы.

Дзіцячыя сукенкі і касцюмы можна шыць з розных матэрыялаў, але можна выкарыстоўваць таксама розныя рэшткі, якія засталіся ад мамінай сукенкі ці бацькавага касцюма. Можна спалучаць нават некалькі матэрыялаў — гэта на дзіцячых сукеначках выглядае вельмі прыгожа.

Вельмі добра выглядае дзіцячая вопратка, пашытая з матэрыялаў у клетку. Можна дадаць сюды белы альбо іншага колеру каўнерчык і манжэты. Дзякуючы чыстаму каўнерыку і манжэтам тая самая сукеначка будзе выглядаць свежа і чыста кожны дзень. Увага для мам: не звяртайце залішне ўвагі на тое, каб дзіця не запэцкалася, каб гуляла асцярожна. Якая ж яму тады будзе прыемнасць з тае гульні, калі ўсе яго думкі будуць канцэнтравацца вакол новай сукенкі?!

Сяброўка





Яны сядзелі пад ялінамі — Вайтхазе, Франке, Будэр і Мартынаў. Вайтхазе прынёс з сабой неспадзяваны пачастунак — качынае мяса ў кансервах. Акрамя таго, бляшанка з цялячым пячоначным паштэтам і бутэлька французскага каньяку.

— Няма Альтэнкірха... — прамовіў Будэр.

Елі качынае мяса, чорныя сухары з паштэтам, ажыну, курылі цыгарэты, пілі каньяк.

— Радзіма не забывае сваіх салдат, — зазначыў Вайтхазе.

Настрой прыўзняўся. У Будэра палягчэла на душы.

— Між іншым, — сказаў Вайтхазе, — я магу паведаміць вам дакладнае размяшчэнне нашага катла. Можа здарыцца, што нас разгоняць ва ўсе бакі, таму вы павінны ведаць, дзе шукаць нашых.

— Ён разаслаў на зямлі сваю карту. — Тут, — тлумачыў ён, — між гэтым возерам і весь гэтымі балотамі, наша першае ўмацаванне. У гэтым месцы і былі спалены варожыя танкі.

Будэр, Франке і Мартынаў нахіліліся да карты. Мартынава захліснула хваля радасці, бо менавіта гэтай хвіліны ён чакаў з самага моманту свайго прызямлення. Яна была яму ўзнагародай за вытрымку, за пакутлівыя начныя пераходы, за рызыку быць забітым сваімі ўласнымі таварышамі. Цяпер, падумаў ён, настаў час рэабілітаваць сябе за тое, што летам 1941 года ён узняў угору рукі.

— Вось тут, — гаварыў далей Вайтхазе, — на гэтай прасецы стаіць адзіная наша процітанкавая гармата — руская мадэль. Раён замініраван, і рускі Іван не раз паламае тут свае зубы. Абысці гэтае месца немагчыма.

Мартынаў напружана сачыў за пальцам Вайтхазе. Трэба запомніць тое месца, дзе знаходзіцца процітанкавая гармата, як праходзіць міннае поле. Ён стараўся ўтрымаць у памяці месцазнаходжанне дзотаў, бункераў, хадоў зносін, сакрэтных пікетаў і лясных завалаў.

— А тут, — працягваў тлумачыць Вайтхазе, — у гэтым гаі, знаходзіцца штаб групы. Там і бункер падпалкоўніка Грэльхамера. А таксама прадуктовыя склады.

„Адзін паветраны налёт, — падумаў Мартынаў, — і фашыстам канец. Або паслаць штурмавую групу цераз балота і спапяліць варожае гняздо агнямётамі. Я сам павяду гэту групу".

— На поўначы, — паведамляў Вайтхазе, — нашы пазіцыі больш тонкія. Але рускія з гэтага боку амаль ні разу нас не зандзіравалі. У гэтай мясцовасці знаходзіцца і паляна, на якую скідаюць нам грузы. Лепш за ўсё, калі нас рассеюць, паспрабаваць прабрацца ў кацёл у гэтыя месцы. Такім чынам, вы бачыце, што кацёл мае амаль дваццаць кіламетраў у даўжыню і восем кіламетраў у шырыню. Вядома, такі плацдарм тысяча чалавек не ўтрымалі б, каб яго подступы не абаранялі возера і дрыгва. Акрамя таго, на ўсходнім фланзе ёсць адзін цікавы пункт — непадалёку ад гэтай вёскі праз балота праходзіць дамба. Сюды рускія ўжо некалькі разоў спрабавалі сунуцца, але кожны раз адкатваліся назад ні з чым.

Правялі яшчэ адзін дзень пад ялінамі. Імжэў дождж, а вечарам, які наступіў даволі рана, узняўся туман, паветра стала халоднае. Яны крыху паразважалі наконт таго, колькі патрэбна самалётаў, каб забяспечыць амаль тысячу чалавек шынелямі, коўдрамі, плашч-палаткамі, ватоўкамі, валёнкамі, рукавіцамі і шалямі.

— Да таго часу іх будзе ўжо менш, — заўважыў Вайтхазе.

Ад гэтых слоў Будэру стала жудасна, ад страху па спіне прабеглі халодныя мурашкі.

На ноч устанавілі парадак дзяжурства: Будэр, Франке, Мартынаў, Вайтхазе, потым зноў спачатку — кожны па паўтары гадзіны, ад васьмі вечара да шасці раніцы.

А адзінаццатай гадзіне пабудзілі Мартынава. Ён выкараскаўся з коўдры і сеў.

— Ваша чарга, — прашаптаў Франке.

— Што, холадна? Потым пабудзіце Вайтхазе.

„Будзіць не буду, — падумаў Мартынаў. Накінуў на плечы коўдру і сабраў канцы яе на грудзях. Аўтамат паклаў сабе на калені. — Пачакаю паўгадзіны — за гэты час Франке засне. Тады ўстану і пайду ад іх да сваіх". — Мартынаў вельмі хваляваўся ад думкі, што вось надыходзіць, нарэшце, момант, калі ён скіне з сябе ганьбу. Пачаў маляваць у думках, як яго сустрэнуць свае, як ён развее іх недавер, паведаміўшы дакладныя раён размяшчэння групы Грэльхамера, якія ў яе сілы і дзе знаходзіцца штаб. Ён адразу падрадзіцца павесці штурмавую групу на разгром штаба Грэльхамера.

Аўтамат ляжыць у яго на каленях — трэба толькі нячутна адцягнуць назад затвор і можна даць тры выстралы. „Адна я ўжо забіў — Альтэнкірха, — думаў Мартынаў. — Гэтых траіх таксама знішчу. Даўно ўжо рукі свярбяць".

На зямлі пад яловымі галінамі ляжалі тры цёмныя постаці — тры чалавекі. Але толькі двое спалі. Трэці паўраспліюшчыў вочы, не адрываючы іх ад шэрага цяню, які вылучаўся на фоне чорнага камля елкі. Франке баяўся Мартынава. „У любы момант ён можа ўсіх нас застрэліць — цяпер ён ведае план размяшчэння групы Грэльхамера".

ТРЫБУНА чытачоў

Зямля ў працавітых руках

Іван Корч і яго цесць Рыгор Ціхі (жывуць разам) з'яўляюцца аднымі з найлепшых гаспадароў вёскі Тафілаўцы Гайнаўскага павету. Гаспадараць яны на 17-ці гектарах зямельных угоддзяў. Хоць зямля ў іх не найлепшая, аднак у сярэднім збожжавыя культуры даюць звыш 20 цэнтнераў з гектара. Гэтаму дапамагаюць мінеральныя ўгнаенні, якіх гаспадары не шкадуюць.


Уся сям'я працавітая і машын многа: касілка, капачка, сеўнік, малацільны агрэгат, усе неабходныя сельскагаспадарчыя машыны і прылады. У іх 8 кароў, 13 кормнікаў (у гэтым ліку 9 кантрактаваных), 3 авечкі і 2 коні.

У Івана Корча залатыя рукі, усё можа зрабіць. У апошнія гады пры дапамозе сям'і пабудаваў мураваны дом, потым хлеў з пустакоў, а ў мінулым годзе прасторную на тры такі клуню на бетонных слупах. Усе будынкі стаяць у сіметрычным парадку. У гэтым годзе гаспадар мае намер пабудаваць вялікую ўзорную абору.

Іван Корч — дасканалы столяр і каваль. У яго свая кузня, дзе ўсе прылады на электрычную перадачу.

Далёка ведаюць аб здольнасцях Івана Корча, ведаюць таксама, што ён усё зробіць хутка і спраўна. А гэта ж яшчэ малады гаспадар, закончыў ён трохгадовую школу сельскагаспадарчай падрыхтоўкі.

М. Панфілюк



Іван Корч. Фота Уладзіміра Несцерука.

Мы былі ў тэатры на „Трыбунале"

Гісторыя была такая: даведаліся мы, што ў Беластоцкім тэатры ідзе п'еса беларускага аўтара, і адразу рашылі паехаць на яе. Трэба падзякаваць тут нашай настаўніцы Лене Тапалянскай, што добра сумела арганізаваць гэты выезд у Беласток, у тэатр Вянгеркі. Наш гурток БГКТ меў умела выгаспадараваныя і адложаныя на ашчаднай кніжцы грошы. Мы нанялі ў ПОМ-е ў Нарве аўтобус і ў радасным настроі 40 чалавек паехалі ў тэатр. Была гэта група людзей — члены гуртка БГКТ і наша мастацкага калектыву. Сярод нас былі і маладыя, якія памагалі нашаму гуртку ў яго выездах на сёлы з мастацкімі пастаноўкамі. За аўтобус мы заплацілі 640 зл., а яшчэ раней выслалі адну з жанчын, каб купіла нам білеты ў тэатры.

Мы ўсе хочам даць высокую ацэнку бацьку Цярэшку. Мы бачылі на яго прыкладзе, як чэсна і скромна можна прайсці праз жыццё, як служыць другім і як цаніць сваю свабоду. Глядзелі мы п'есу і то смяяліся, то слёзы плылі ў нас з вачэй. Нам спадабалася прадстаўленая аўтарам беларуская сям'я, якая больш, чым жыццё, цаніла Радзіму. Вяртаючыся дадому познім вечарам, мы глыбока задумаліся над лёсам Валодзі, які аддаў жыццё за Радзіму.

Анна Стахвіюк з Трасцянкі

Паволі, быццам у сне, Франке перавярнуўся на бок, намацаў рукой кабуру і выцягнуў пісталет. Потым зноў з ціхім стогнам прыняў ранейшую позу і пад коўдрай падцягнуў пісталет наперад.

„Франке яшчэ не спіць, — думаў Мартынаў. — Толькі што паварушыўся. Хай пройдзе паўгадзіны, мінула ж яшчэ толькі дзесяць мінут. А тады перастраляю іх. Летам 1941 года я выпусціў чатыры кулі, але ніводная не трапіла ў цэль. На днях аднаго фашыста забіў. Зараз заб'ю яшчэ траіх. Не тады, дык цяпер".

Раптам Мартынаву прыйшло ў галаву, што вялікая розніца — застрэліць ворага ў бойцы ці калі ён безабаронны і спіць. Яны з Будэрам ляцелі на самалёце, разам многа начэй крочылі поплеч па лясах. Франке і Вайтхазе дзяліліся з ім ежай, а ён з імі апошняй цыгарэтай. „Але яны фашысты, — развažаў ён, яны ворагі. Засталося пятнаццаць мінут. Навошта, уласна кажучы, чакаць? Цяпер усё ясна. Мне вядома, дзе знаходзіцца Грэльхамер, і наогул я ведаю зараз больш чым савецкія таварышы. Заб'ю гэтых фашыстаў і пайду".

Нечакана ў памяці яго ўсплыў твар Вайтхазе. Неяк, калі Мартынаў упаў і выбіхнуў сабе шчыкалатку, Вайтхазе апусціўся на калені і пачаў рабіць масаж, супакойваючы яго голасам, поўным спагады: „Пацярпіце. Вам цяпер крыху балюча, затое адразу стане лепш".

(Працяг будзе)

Новая гаспадарка ў Бабіках

Раней жыхары Бабікаў (Сакольскі павет) і навакольных вёсак, каб нешта набыць, або аформіць нейкую справу, вымушаны былі ехаць за 10—15 км у Шудзялава. Цяпер, калі тут створана гміна, справы змяніліся на карысць сялян. Ужо будуюцца (праўда, правізарычныя) склады на мінеральныя ўгнаенні і пашу. ГС у Крынках адкрывае тут свой філіял. СОП з Шудзялава ўжо залажыў у Бабіках свой філіял і не трэба ўжо за пазыкай ездзіць у Шудзялава. Адкрыты пастарунак міліцыі і кіёск „Руху". Яшчэ будуць ветэрынарны і скупачныя пункты. Начальнік гміны Антон Гурскі мае вялікія цяжкасці, каб знайсці ўсім адпаведныя памяшканні.

А. С.



Дарагое „Сэрцайка"!

Мне 18 год. Жыву я на вёсцы, а вучуся ў недалёкім горадзе. У гэтым годзе я буду здаваць матуральныя экзамены.

Аднойчы ў нашай вёсцы была забава, на якой я пазнаёмілася з хлопцам з суседняй вёскі. Іх цэлы вечар з ім гуляла, потым ён правёў мяне дадому і сказаў, што прыедзе да мяне ў бліжэйшую нядзелю. Я не згадзілася, сказала, што мне трэба вучыцца, рыхтавацца да матуры і думкі аб хлопцах перашкодзілі б мне ў вучобе. Коля (так завецца гэты хлопец) не прыехаў, але я потым апаміталася і вельмі шкадую сваіх слоў.

Аднойчы ў горадзе я сустрэла яго. Размаўляла з ім, і Коля даў мне зразумець, што ходзіць з дзяўчынай са сваёй вёскі. А я цяпер не магу яго забыць, навука таксама мне не ідзе ў галаву.

Парай „Сэрцайка", што зрабіць, каб Коля вярнуўся да мяне.

Вера з Бельскага павету

Вера! Твой паступак лічу вельмі разумным і хвалю цябе за гэта. Хай будзе ён прыкладам для многіх маладых дзяўчат-школьніц. Пра Колю перастань думаць. Калі ён цябе не зразумеў, а пры спатканні яшчэ хваліцца, што мае іншую дзяўчыну, дык з гэтага відаць, што хлопец ён несур'ёзны і не варты тваёй увагі. Будзь ганаровай і не шукай спосабу, каб яго да сябе прыцягнуць, а паступай паводле прымаўкі: „Калі ён не хоча цябе раз — дык ты яго — дзесяць раз". Ты дзяўчына маладая, закончыш школу і напэўна спаткаеш хлопца, які табе спадабаецца і з узаемнасцю. А цяпер не траць часу. Набліжаецца ж канец года, мабілізуй усе свае сілы і ўвагу толькі на навуку, тым больш што ты ў матуральным класе і чакаюць цябе, як сама пішаш, хутка экзамены на атэстат сталасці. Гэта ў жыцці вельмі важная справа, і трэба зрабіць усё, каб гэтыя экзамены здаць як найлепш!

„Сэрцайка"

Хто адказны за непарадкі?

Дубяжынскі сельгасгуртток мае вялікія клопаты з вядучым сельгасгуртком у Казлах, які павінен абслугоўваць машынамі Дубяжына і якому на гэтыя мэты дубяжынцы перадалі 750 тысяч злотых. Грошы дык узялі, а машын не даюць. Старшыня сельгасгуртка ў Дубяжыне ездзіў у гэтай справе ў павет, прасіў, каб прыехалі, зрабілі сход, растлумачылі. Але ніхто не з'явіўся. Відаць, баяцца паказацца людзям на вочы: што такі балаган стварылі для вёскі. Бо падумайце, як дасталі машыны да малацьбы, дык былі яны ўсе папсутыя. Людзі абураліся, пазычалі машыны з іншых гурткоў, дзе добра пастаўлена праца. Чаму павет не зацікаўіцца такімі непарадкамі?

М. Р.

Кансультацыя ЮРЫСТА

ПЫТАННЕ: Ці важнае будзе завяшчанне, пры складанні якога ў якасці сведкі была асоба, якая не ўмее чытаць і пісаць па-польску (завяшчанне складзена на польскай мове)? Асоба гэта ўмее чытаць і пісаць па-руску і па-беларуску.

АДКАЗ: Закон прадугледжвае, што не можа быць сведкам пры складанні завяшчання асоба, якая не можа чытаць і пісаць, або якая не знае мовы, на якой завяшчанне складзена. Нават асоба адукаваная, калі не можа чытаць або пісаць, напрыклад, сляпы — не можа быць сведкам. Аднак сведкам можа быць асоба, якая можа чытаць і пісаць на іншай мове, калі ведае мову, на якой напісана гэта завяшчанне. Гэта значыць, што ў выпадку, які пададзены ў пытанні, сведка ведае польскую мову і можа чытаць па-руску і па-беларуску, дык можа быць сведкам пры складанні завяшчання, і завяшчанне, падпісанае гэткім сведкам хоць бы кірыліцай, будзе важнае, калі будуць споўнены іншыя ўмовы, патрэбныя да важнага завяшчання.



ВЯСНОЮ

Пацяплела і сонца лепш грэе,
Па рацэ лёд кускамі плыве.
А з-пад лужы на нас паглядае
Траўка свежа, зялёна: жыве.

Хутка снег ад праменняў расплыўся,
З гары прэцца вясёлы струмень.
Пагляздзі, ўжо вандроўныя птушкі
Прыляцелі да нас на пругмень.

Быстра ластаўка села на стрэху,
Штось маленькім дзюбкам там клюе.
Пэўна, хатку сваю папраўляе,
Гразззю лепіць, саломкаю ўе.

А на стрэху ўзабраўся ўжо бусел,
Другі пырай у дзюбе нясе.
Гэта хату будуюць таксама,
Уюць гняздо на маём калясе.

Кукаваць будзе тут нам зязюлька,
Жаваранкі пад неба ўзлятаць,
Заспяваюць таму хлебаробу,
Як пачне зноў на хлеб працаваць.

Вобраз пекны, цудоўны, як ў казцы,
Дыхнуў запах знаёмы, лясны,
Цэлы рок: зіма, лета і восень...
Няма лепшай пары ад вясны.

Ян Манюшка, Трыпуце

НАРВА РУШЫЛА

Плыве сабе Нарва між лазы карчоў,
Што почкі зялёныя к сонцу ўзнялі.
Рака узнялася з жоўтых берагоў,
Бурыя хвалі морам паплылі.

Стагі крыва дзівяцца, растапырыстыя,
Губяць сена барадатымі ахапкамі,
Абарогі прысадзістыя
Параскідаліся будкамі-хаткамі.

Міра Лукша



Юрка Харкевіч, Ляшукі. Верш аб вясне нам спадабаўся і абавязкова яго надрукуем. Чакаем новых вершаў.

Аляксандр Раманюк, Дубяжына. Хвалім за прыгожае абавязацельства, якое вы выказалі ў вершы. Надрукуем.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Daleka jest droga" (polski), 24—25. „Raj na ziemi" (polski), 26—28. „Album polski" (polski), 28—29.

Нараўка
„Przygody psa Cywila" (polski), cz. I „Milion lat przed naszą erą" (angl.), 25—29.

Нарва
„Agnieszka 46" (polski), „Doń Gabriel" (polski), 25—29.

Чыжы
„Zaraza" (polski), „Żandarm z gór" (bulg.), 5—29.

Дубічы Царкоўныя
„12 krzeseł" (polski), „Perła w koronie" (polski), 25—29.

Арэшкава
„Trup w każdej szafie" (czeski), „Bajka o Mrozie Czarodzieju" (radz.), 28—29.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Ballada o Cable u Hugue u" (USA), „Zdobywcy nieba" (radz.), 25—29.

Орля
„Trzecia część nocy" (polski), „Kochany drapieżnik" (radz.), 25—29.

Райск
„Dzikie dziecko" (franc.), „Dawid Copperfield" (ang.), 25—29.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава
„Umrzeć z miłości" (franc.), „Bajka o zmarnowanym czasie" (radz.), 25—29.

Янаў
„Jarzębina czerwona" (polski), 25—29.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Gang Olsena" (duński), 24—25. „Powrót rewolwerowca" (USA), 26—27. „Czarownice z Bagien" (radz.), 28—29.

Мельнік
„Kajtek i nowy braciszek" (węgierski), 24—25. „Niech bestia zdycha" (franc.) 26—27. „Początek nowego świata" (rumuński), 28—29.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Ocalenie" (polski), „Czarodziej Fablo" (franc.), 25—29.

Новы Двор
„Kopernik I i II cz. (polski), „Zabijcie czarną owcę" (polski), 25—29.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł., półrocznie: 14,40 zł, kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty na prenumeratę indywidualną dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch" Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40%.

BZGraf. Nakład 8 202 K-1

ВОСЬ ЯНО ШТО!

Вясною Януар Чарапаха стаў прыкмячаць, што яго сусед Пятро Дзяркач цэлымі вечарамі праседжвае каля акна і за чымсьці назірае.

— І што ён там убачыў? — вярцелася думка ў Чарапахі.

Некалькі вечароў шнарыў Чарапаха па месцы, куды ўглядаўся Дзяркач: абмацаў кожнае дрэўца, зазірнуў пад кожны корч і, не знайшоўшы нічога падазронага, зусім страціў спакой. А Дзяркач, як на тое, усё тырчаў у сваім акне і што найбольш раздражняла Чарапаху, шчасліва ўсміхаўся.

— Слухай, Людміла, — спытаў Чарапаха жонку, — як ты думаеш, што гэта Дзяркач там выседжвае?

— Хто яго ведае, — паціснула плячыма Людміла, — відаць, не мае работы, вось і сядзіць.

— Ой, не гавары, — нахмурыўся Чарапаха, — нешта тут не чыстае, не будзе ж чалавек вось так, ні сеў, ні ўпаў, каля акна слупянець.

— Калі цябе так цікавіць, дык і спытай у яго, а мне няма часу такімі глупствамі галаву забіваць.

— Гм, — не знаходзіў сабе месца Чарапаха, — ты думаеш — гэта глупствы? Глыбока памыляешся. Нешта тут ёсць.

Нейк, ідучы з працы, ён сустрэўся з Дзеркачом:

— Вечар добры, сусед.

— Добры вечар.

— Вясны дачакаліся, раскошна наўкола — хутка і маладой цыбулькі пакаштуем.

— Найпрыгажэйшая пара году! — удыхнуў на поўныя грудзі паветра Дзяркач. — Ведаеце, я найбольш люблю вясну: усё прачынаецца, усё цвіце, усё да сонца цягнецца...

— Вясну любіце, а на двары я вас нешта ніколі не бачу.

— А мне і так усё відаць. Між вашаю хатаю і Кліменчуковаю ёсць прастор. Дык вось я вечарамі з акна лявадаю любуюся і салавейку слухаю. Там, ведаеце, хіба ж нейкі чараўнік пасяліўся!

— Вось яно што! — звёў бровы Чарапаха і паспешна развітаўся з Дзеркачом.

За паўгадзіны, з ног да галавы абляпаны граззю, Чарапаха з доўгаю тычкаю ў руках ганяўся па лявадзе за чараўнікам-салавейкам...

А калі ўвечары Пятро Дзяркач выглянуў з свайго акна, дык неспадзявана выявіў, што прастор між Чарапахаваю і Кліменчуковаю хатамі завешаны нагавіцамі ды падзертым радном.

На суседнім панадворку шчасліва хіхатаў Чарапаха.

Павел Дабранскі

Вясенняя спеўка.

НІЎКА

Талавапомка

Трэба пераправіцца праз рэчку шырынёй у 3,5 м з дапамогай двзюх дошак, кожная даўжынёй у 3 м. Як гэта зрабіць?

* ✲ *

Адказ на заданне з папярэдняга нумара:

ГУМАР З

ЗДАГАДАЎСЯ

Нарадзілася ў бедняка дзіцё. Вось бацька і папрасіў за хроснага багатага суседа, які меў вялікую пасеку.

Не мінула і тыдня, як бядняк зноў прыйшоў да багацея:

— Ведаеце, куме, нешта ваш хроснік усё „мё" ды „мё" кажа. Я спачатку не мог зразумець, чаго яму трэба, аж урэшце здагадаўся — мёду хоча!

Тата ідзе на футбол.

ДЗЯВОЧАЯ НЕ ЛІРЫЧНАЯ

Ты пад акном не стой
Да самай раніцы.
Я не пайду з табой,
Ты горкі п'яніца.
Я не хачу з табой
Быць і хвілiначкі,
Бо ў цябе любоў
Да чацвярцiначкі.
Ужо не раненька,
Не страш пагрозамі,
Ты хлопец п'яненькі,
А я цвярозая.
Ну як з табой мне быць,
Ах, мой міленечкі,
Умееш ты хадзіць
На чацвярэнечках.
З табой нам не гуляць
Густым бярэзнікам,
Ты любіш начаваць
У выцвярэзніках...

Рыгор Барадулін

ЛІШНІЯ ТУРБОТЫ

— Я не ўпэўнены, — сказаў хворы, — ці знойдзецца ў вас лякарства ад маёй хваробы.

— Што вы, — запярэчыў лекар, — у нашай бальніцы столькі лякарств, што для некаторых пакуль яшчэ і хвароб няма.

КОЛЬКІ ГАВАРЫЛА

Маленькі Міхасёк расказвае сваёй маме:

— Ведаеш, каго я бачыў? Мыш, велізарную, як гіпапатам!

Маці паціскае плячыма:

— Я табе ўжо трыццаць шэсць мільёнаў разоў гаварыла, каб ты ніколі не перабольшваў!

ВІННЫЯ ПРЫМАЎКІ

У віна спыталі: „Ты прыносіш гора ці шчасце?" Віно адказала: „Колькі шчаслівых — не ведаю, а гаротнікам і ліку няма".

✲

Хто віно п'е ў доўг, той двойчы п'янее: і калі п'е, і калі разлічваецца.

✲

Напаілі казла віном — пайшоў з ваўком біцца.

✲

Дзе хлеб, там і жыццё, дзе віно, там і лодарнічанне.

✲

Хто віно п'е, у таго бацькі плачуць.

✲

Віно чалавека не заб'е, але да сабачага жыцця давядзе.

✲

Віно пі з маленькай пасудзіны, веды — з вялікай.

СКАРОЧВАЕ ЖЫЦЦЁ

Скардзіцца п'яніца:

— Гэта праўду кажуць, што гарэлка скарочвае жыццё. Як вып'еш зранку грамаў трыста, дык дзень праляціць, як адна гадзіна. А як няма ў кішэні нават на куфаль піва, — дык дзень такі до-о-оўгі-доўгі...

НАРМАЛЬНАЯ ЖОНКА

Сустрэліся сябры. Разгаварыліся.

— Чуў я, дружа, што ў цябе вельмі сярдзітая жонка, — кажа адзін.

— Ды не, жонка ў мяне нармальная: як зробіш добра — не пахваліць, а як дрэнна — дык вылае, — сказаў другі.

„АДВАЖНЫ" ПАЛЯЎНІЧЫ

Двое адправіліся на паляванне. Калі яны зайшлі ў густы чарот, адзін з іх сказаў:

— Асцярожна, тут могуць быць качкі...

— Хай сабе будуць. Ты думаеш, я іх баюся?! — адказаў другі.

МІНІБАЙКІ

ПАРА ПАКОНЧЫЦЬ!

Заяц выступіў з заявай:
— Пара пакончыць з Мядзведзем!
Нечаканая для зайца смеласць!
Відаць, Мядзведзь у лесе здох.

ІНДЫК

У індыка быў намеснік — шпак. Пачаў індык думаць, як ад яго вызваліцца. Думаў, думаў — і здох.

З непрывычкі — раней за яго шпак думаў.

М. Азаў, У. Цiхвінскі

...Ён вельмі разгневаўся на мяне, калі даведаўся, што я аб ім такой жа думкі, якой ён аба мне.

...Ён стаяў вышэй усіх забабонаў, апрача ўласных.

КУРЁЗЫ

ПРАЗ КОЖНЫЯ ТРЫ МІНУТЫ

Часы мяняюцца: цяпер наследнікі зладзеяў, якія паказаны ў вядомым італьянскім фільме „Выкрадальнікі веласіпедаў", займаюцца больш сучасным, а галоўнае больш даходным бізнесам — крадзяжом аўтамабіляў. У мінулым годзе італьянскія зладзеі ўкралі сто семдзесят пяць тысяч машын — удвая больш, чым французскія, англійскія і заходне-германскія выкрадальнікі, разам узятыя. Скаргі ад пацярпеўшых уладальнікаў аўтамабіляў паступалі ў італьянскую паліцыю ў сярэднім кожныя тры мінуты.

АБОДВА Ў НАКДАЎНЕ

Алімпійскі рынг Токіо стаў сведкам даволі рэдкага выпадку: у час бою румына Канстанціна Круду і кубінца Роберта Камінера сапернікі „сінхронна" нанеслі адзін аднаму моцныя ўдары і... абодва аказаліся ў накдаўне. Камінера адразу ж ускочыў, а яго сапернік не мог прыняць баявую стойку да ліку „восем". Але пераможцам аказаўся ж Круду, якому пасля трэцяга раунда чатыры арбітры з пяці аддалі перавагу.

ЯК ГУКНЕШ...

Нядаўна жыхар Лондана Рой Мітчэл узбудзіў судовую справу супраць свайго суседа, скардзячыся, што ў адну з нядаўніх начэй на працягу некалькіх гадзін той літаральна не даваў яму заплюшчыць вачэй. Паводле слоў Мітчэла, з кватэры суседа неслася „дзікая джазавая какафонія".

Аднак, на здзіўленне скаржніка, іск быў адхілены. Сусед прадставіў суду сведак, якія пацвердзілі, што „дзікая какафонія", аб якой ішла гутарка, на самай справе была запісам гулянкі, якая адбылася папярэдняй ноччу ў кватэры самога Мітчэла.

Смяюцца з намі

Певень здзіўляў сваім спевам куратнік, а думаў, што здзіўляе ўвесь свет.